Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарамі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пашпарамі паперэд тэксту 1 р. — к.
За радок пашпарамі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сэнсацыйныя на 50 проц. даражэй.
Пазы тарыфу бярэцца 10 проц. аплаты.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант
За кожны дадатковы
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы
на дакумент
За кожны дадатковы
Публікацыя ЗАГУ — 3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэлег. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 56 (2545) Нядзеля, 10-га сакавіка 1929 г.

УЗМАЦНІМ ХЛЕБАЗАГАТОЎЧЫ ФРОНТ.

МАСКВА, 9-III. «Правда» ў перадавіцы пад загалоўкам «Усилить хлебозаготовки» піша: «Наступаючыя з месц весткі аб ходзе хлебазагатовак гавораць аб вельмі слабой працы загатоўчага апарату. Між тым меўшае месца недавыкананьне пляну ў лютым павінна быць абавязкова кампэнсавана ў сакавіку. Патрэбна ў самым тэрміновым парадку падагнаць адстаючыя арганізацыі, каб выпрастаць фронт хлебазагатовак.

У леташнім годзе пералом у пасыўнасьці хлебазагатоўчага апарату наступіў у значнай меры ў выніку ўжываньня надзвычайных мер. Сёлета мы цьвёрда адмовіліся ад ужываньня надзвычайных мер і з самага пачатку кампаніі намецілі шэраг мерапрыёмстваў эканамічнага парадку.

У якасьці важнейшага фактару хлебазагатовак павінна цяпер праводзіцца дастаўка на вёску прамысловых тавараў. Далейшае зьніжэньне загатовак ніякім чынам нельга тлумачыць зьмяншэньнем запасаў. Водгук даных, зноў праверэных у ходзе хлебазагатоўчае кампаніі, можна завярэць, што запасы хлеба на вёсцы бязумоўна забясьпечваюць выкананьне намечаных пляноў.

Загатоўчыя арганізацыі тлумачаць зьніжэньне загатовак шэрагам аб'ектыўных прычын. Самым-жа галоўным недахопам у правядзеньні мер грамадзкага ўплыву належыць лічыць адсутнасьць сколькі небудзь сур'ёзнай масавай арганізацыяй працы сярод бядняцкай і сярэдняцкай частак вёскі. Праверка грамадзкае працы ў шэрагу раёнаў паказала, што кааперацыйны актыў часта лічыцца на паперы, прозьвішчы актывістаў грамадзкім арганізацыям невядома, актывісты, якія маюцца ў наяўнасьці, не выкарыстоўваюцца. Загружанасьць незавога апарату чужымі элемэнтамі, слабасьць грамадзкае працы і ўтвараюць грунт для ажыўленьня кулацтва, для актывізацыі аказваемага імі супраціўленьня.

Улічваючы ўсе выяўленыя недахопы, трэба прыняць самыя энэргічныя і рашучыя меры да іх вынішчэньня і да забесьпячэньня неадкладнага разьвіцьця хлебазагатовак.

Трэба значна ўзмацніць працу па арганізацыі мас, згуртаваньню беднаты з сярэдняком, да разьвіцьця грамадзкасьці. Разьвіцьцё хлебазагатовак дапаможа нам палепшыць дастаўку хлеба і ўпарадкаваць адлічэньне ў карысьць беднаты ўстаноўленых процантаў з гарнцавага збору. Усёй сумай матар'яльных і грамадзкіх мерапрыёмстваў мы павінны дамагчыся ў самым тэрміновым парадку пералому ў ходзе хлебазагатовак. У зьвязку з набліжэньнем вясеньняга засеву мы павінны ў дзесяць разоў павялічыць усе захады і забясьпечыць выкананьне ўсяго народна-гаспадарчага пляну, для якога хлебазагатоўкі вызначаюцца ў даны момант самым адказным зьвяном.

ЗЬМЕНА ПОЛЬСКАЕ КАНСТЫТУЦЫІ АДНІМАЕ РЭШТУ ПРАВОЎ У НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ.

БЕЛАРУСКІ ДЭПУТАТ У СОЙМЕ ГАЎРЫЛЮК ПРАТЭСТУЕ СУПРОЦЬ ЗЬМЕНЫ КАНСТЫТУЦЫІ.

ВАРШАВА. На пленарным пасяджэньні сойму на пытаньні аб зьмене канстытуцыі выступіў беларускі дэпутат Гаўрылюк ад імя сялянска-работніцкага Беларускага клюбу (фракцыі). Ён зачытаў такую дэкларацыю: «Абшары Заходняе Беларусі далучаны да сучаснае польскае дзяржавы шляхам ваеннае акупацыі ў інтарэсах польскае буржуазеі і абшарнікаў, проці жаданьня беларускага жыхарства. На беларускіх рабочых і сялян польская ўлада глядзіць як на заваяванае калёніяльнае жыхарства, на іх накладзены вялікія падаткі, яны знаходзяцца пад эканамічным прыгнечаньнем, пазбаўлены фактычна ўсіх палітычных правоў і і залежаць цалкам ад самаўладзтва адміністрацыйнае і паліцэйскае ўлады. Беларускае жыхарства ніколі ня згодзіцца з сучасным падзелам Беларусі на дзве часткі, яно будзе імкнуцца да аб'яднаньня і поўнага сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня. Існуючая цяпер сакавіцкая канстытуцыя 1921 году з яе несапраўдным дэмакратызмам зьяўляецца на справе для польскае буржуазеі фігавым лісткам, які нагла прыкрывае гвалт над правамі рабочага і селяніна, а таксама над нацыянальнымі меншасьцямі. Беларускія масы ня раз мелі магчымасьць пераканацца, як буржуазея і буржуазны ўрад адносяцца да сакавіцкае канстытуцыі. Беларускія дэпутаты, якія ў ранейшым сойме імкнуліся канстытуцыйным парадкам абараняць правы беларускага жыхарства, знаходзяцца зараз за кратамі, засуджаныя на 12 гадоў астрогу. Добрай ілюстрацыяй таго, як ажыццяўлялася канстытуцыя, зьяўляецца спосаб правядзеньня выбараў у сучасны сойм. Шматлікія гвалты, машэньніцтвы, арышты кандыдатаў, скасаваньне сьпісаў, гвалт над воляю выбаршчыкаў, — усё гэта выклікала тое, што па ўсёй Польшчы і асабліва Беларусі, выбары зусім не адбіваюць думкі працоўных. Прадстаўнікамі беларускіх земляў у сойме апынуліся ў значнай большасьці назначэнцы ўраду і валвод. Тыя нямногія прадстаўнікі працоўных мас, якім удалося прайсьці ў сойм, тут у сойме на кожным кроку натыкаюцца на пажымы і прасьледаваньні. Гэтыя факты паказваюць, якім зьяўляецца сапраўдны кошт правамоцнае да гэтага часу канстытуцыі. Яна заўсёды была і засталася фікцыяй.

Пры такіх умовах зьмена канстытуцыі, прапанаваная ўрадавымі коламі, зьяўляецца нічым іншым, як узаконьненьнем таго, што фактычна ўжо існуе, жаданьнем узаконіць усе ранейшыя і будучыя беззаконствы ўлады. Сучасная зьмена канстытуцыі імкнецца, апроч таго, да ліквідацыі рэштаў тых правоў, якімі яшчэ карыстаюцца працоўныя масы, да абсалютнага прыгнечаньня падняволеных працоўных мас, да ўцягненьня іх у жалезныя абцугі фашысцкае дыктатуры.

Прапанаваная зьмена канстытуцыі імкнецца пазбавіць нацыянальныя меншасьці ўсіх рэштаў ранейшых правоў; яна імкнецца і да таго, каб стабілізаваць палітыку неабмежаванага гвалту, прыгнечаньня, эксплёатацыі; да таго часу, пакуль урад знаходзіцца ў руках абшарнікаў і капіталістаў, праводзіць імпэрыялістычную, антырабочую, антысялянскую палітыку,—нават самая лепшая папяровая канстытуцыя будзе ўсё-ж такі парушацца гэтым урадам.

Сялянска-работніцкі Беларускі клюб заявляе, што лёс працоўных мас залежыць ад іх саміх, залежыць ад іх штодзённае барацьбы за свае правы, ад наладжаньня салідарнасьці з міжнародным пралетарыятам. Беларускі сялянска-работніцкі клюб заяўляе, што ён ня будзе ўдзельнічаць у пераглядзе канстытуцыі, бо ён лічыць пытаньне канстытуцыйнае зьмены, прапанаванае буржуазеяй, абшарнікамі і іх прысьпешнікамі, справаю, якая ўжо ў аснове сваёй дае беларускім працоўным масам яшчэ большае пагоршаньне ўмоў жыцьця з пункту гледжаньня грамадзкага, а таксама і палітычнага. Мы будзем галасаваць проці прапановы аб зьмене канстытуцыі».

Прывітаньне т. Сталіну

ад Ленінградзкай абласной партканфэрэнцыі.

ЛЕНІНГРАД, 8-3. 4 дзень працы 2-й абласной партыйнай канфэрэнцыі. Ранішняе пасяджэньне адчынілася прывітаньнямі рабочых Маскоўска-Нарвускага раёну. Ад інжынэраў і беспартыйных рабочых Паўночна-Заходняе чыгункі прывітаньне перадае т. Саўрамовіч. На ранішнім пасяджэньні канфэрэнцыя заслухала даклад т. Косава аб працы абласной КК-РСІ. Пасьля дакладу канфэрэнцыя распачала спрэчкі. Пад доўгія і гучныя воплескі канфэрэнцыя аднагодна пастанаўляе паслаць наступную прывітальную тэлеграму т. Сталіну.

«Дарагі тав. Сталін, 2-я Ленінградзкая абласная партканфэрэнцыя пасылае табе, генэральнаму сэкратару ЦК УсеКП(б) непарушнаму і вытрыманаму саратніку Ільліча, іспытанаму барацьбіту за ленінізм, і ў тваёй асобе ЦК УсеКП(б) братэрскае камуністычнае прывітаньне. Выразна ўяўляючы стаячыя перад партыяй і краінай дзяржасьці, Ленінградзкая арганізацыя на раённых і абласных канфэрэнцыях выявіла поўнае аднадушша па асноўных пытаньнях нашае палітыкі і бальшавіцкую гатоўнасьць рашуча і напружана працаваць над перамогаю ўсіх пяжкасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва.

Канфэрэнцыя лічыць, што ў сучасны момант, як і раней, у моманты цяжкасьцяў, уліяісты і гатовыя да адступленьня хістаючыяся элемэнты свой адыход ад ленінізму замазваюць суровымі нападкамі і паклёпам на найбольш цьвёрдых праваднікоў партыйнага курсу, Ленінградзкія камуністы рашуча адмятаюць капітулянцкую ідэалёгію правых уліяістаў, якая прыкрываецца наскрозь фальшывымі і абураючымі нападкамі на ЦК і найбольш цьвёрдых праваднікоў пастаноў 15-га партыйнага зьезду.

Канфэрэнцыя заўважае, што ленінградзкія бальшавікі і наперад будуць аказваць ЦК поўнае падтрыманьне ва ўсёй яго працы і ў барацьбе з уліямі ад генэральнае лініі нашае партыі, асабліва з правым уліям і прымірэнчымі да яго адносінамі. Няхай жыве сталёвае адзінства і бальшавіцкая згуртаванасьць шэрагаў УсеКП(б). Няхай жыве Ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б). Канфэрэнцыя паслала таксама прывітальную тэлеграму міжнароднаму жаночаму сэкратарыяту Камінтэрну.

На сэсіі рады Лігі Нацый.

ПЫТАНЬНЕ АБ ПЭТЫЦЫІ, ПАДАДЗЕНАЙ НЯМЕЦКАЮ МЕНШАСЬЦЮ ВЕРХНЯЕ СІЛЕЗІІ.

ЖЭНЕВА, 8-III. У сучасны момант цікавасьць згрупавана на заключным пасяджэньні сэсіі рады Лігі Нацый 9 сакавіка па пытаньні аб пэтыцыі, пададзенай нямецкаю меншасьцю польскае Верхняе Сілезіі ў Лігу Нацый. У сучасных перамовах між міністрамі, на якіх, бясспрэчна, абмяркоўваюцца ўсе пытаньні аб польска-нямецкіх дачыненьнях, адшукваецца форма найбольш мірнага абмеркаваньня пэтыцыі, каб не паўтарылася стычка, якая мела месца ў Лугано (канфлікт між Штрэзэманам і Залескім).

БРЫЯН І ЧЭМБЭРЛЕН ЛОВЯЦЬ НА ВУДАЧКУ ШТРЭЗЭМАНА.

ПАРЫЖ, 8-3. «Эко-дэ-Пары» паведамляе, што ў Жэневе адбываліся перамовы між Брыянам, Чэмбэрленам і Штрэзэманам па пытаньні аб рэпарацыях, прычым Брыян і Чэмбэрлен імкнуліся пераканаць Штрэзэмана ў неабходнасьці «зрабіць уціхамірваючы ўплыў» на нямецкага дэлегата ў камісіі экспэртаў Шахта. Далей газэта піша: «Францускія палітычныя фінансавыя колы добра разумеюць, што ажыцьцяўленьне пляну Олюэна Юнга (аб заснаваньні новага міжнароднага „рэпарацыйнага органу") зьвязана з сур'ёзнымі нявыгодамі, бо было-б небясьпечна надаць эмісійным банкам (якія павінны адыгрываць пераважаючую ролю ў гэтым «органе») уладу, якая сапраўды стаіць над дзяржавамі і дзейнічае пад кіраўніцтвам банкаўскіх колаў Злучаных Штатаў».

НАМЕРЫ ГУВЭРА ЗБЛІЗІЦЦА З СССР?..

ЛЁНДАН, 8-3. Вашынгтонскі карэспандэнт «Таймс» піша: «Ёсьць, хоць і слабыя, але пэўныя адзнакі, якія сьведчаць, што прэзыдэнт Гувэр хутка зьверне ўвагу на пытаньне аб узаемадачыненьнях з СССР. Калі Гувэр і ня думае ісьці так далёка, як сэнатар Бора, дык усё-ж такі відома, што ён хоча адхіліць данае пытаньне без стороннага разгляду. Тут ужо гавораць аб магчымасьці паслаць экакамічную місію ў СССР".

ФАЛЬСІФІКАТАР АРЛОЎ—САМ АБ САБЕ

БЭРЛІН, 8-3. Учора Арлоў меў спатканьне з сваім абаронцам Яффэ і апавядаў яму свой жыцьцяпіс, спамянуўшы аб сваёй блізкасьці з ранейшым кіраўніком бэрлінскае паліцыі для чужаземцаў Бартэльсам, які быў звольнен за хабарніцтва. «Ротэ Фанэ» сьцьвярджае, што і пасьля звальненьня Бартэльса сувязь Арлова з вышэйшаю паліцэйскаю ўладаю ня спынялася. «Аж да апошняга часу—піша газэта,—Арловым карысталіся, як даносчыкам аб асобах, якіх падазравалі ў бальшавізьме, хоць уладзе было вядома, што ў 1922 г. Арлоў актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы замаху на Чычэрына, Красіна і Ракоўскага. Гэтыя абставіны былі выкрыты на працэсе Дружалоўскага ў Маскве. Больш таго, Савінкаў увесь час завяраў, што разам з Арловым, Дружалоўскім і Эльвэнгрынам ён па даручэньні ангельскага шпіянажу падрыхтоўваў зьвяржэньне савецкае улады, шляхам замахаў на выбухі заводаў і інш. Газэта паправае паліцэй-прэзыдэнта сацыял-дэмакрата Тэргібэля, міністра ўнутраных спраў сацыял-дэмакрата Грэзэнскага і яго папярэдніка сацыял-дэмакрата Дэвэрынга ў тым, што злачынствы Арлова проці СССР яны разглядалі, як найлепшую рэкамэндацыю. Пасьля звальненьня Бартэльса Арлоў і Дзівэрс увайшлі ў блізкія дачыненьні з Гельлерам бэрлінскае палітычнае паліцыі, а таксама з Мюльэдзенам у камісіі адказнага парадку. Арлоў і Дзівэрс мелі таксама сувязь з агентам ангельскага шпіянажу Дэйлі. Гуманскі наладжваў на сваёй віле ў ваколіцах Бэрліну п'яныя оргіі, у якіх, водгук чутак, удзельнічалі таксама і прадстаўнікі бэрлінскае палітычнае паліцыі". Абаронца Арлова Яффэ лічыць, што аб прыцягненьні Арлова і Сумарокава да суду наўрад ці можа быць гутарка, таму што ў налічасьці няма злачынства, паскольку амэрыканскі журналіст адразу павінаў падлог і дзеньгі арыштаваных ня былі пакіраваны проці нямецкае дзяржавы.

САКРЭТНЫ ЎГАВОР між Польшчай і Румыніяй.

Угавор накіраваны проці СССР і Літвы.

Выкрываньні газэты „Летувос Айдас".

КОЎНЯ, 8—3. Літоўскі афіцыёз «Летувос Айдас» друкуе сэнсацыйнае выкрываньне аб сакрэтным угаворы між Польшчай і Румыніяй, накіраваным супроць СССР і Літвы. Як відаць з тэксту ўгавору, польская і румынская армія ў выпадку ўзьнікненьня вайны павінна паевэьці свае апэрацыі супроць СССР супольна.

Згодна выкрываньням «Летувос Айдас», перад пачаткам вайны павінен быць прад'яўлен ультыматум з боку Польшчы, патрабуючы ад СССР, каб зараз-жа была эвакуіравана прыфрантовая паласа, скасован загад аб мабілізацыі і разброены рэвалюцыйныя атрады. Калі на працягу 10 дзён урад СССР гэты ультыматум ня выканае, дык польская і румынская армії павінны каардынавана павесьці наступ на СССР.

„ИЗВЕСТИЯ" АБ ПРАЦЭСЕ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДЫ.

пілсудчыкі імкнуцца ліквідаваць вызваленчы рух беларускага народу.

МАСКВА, 9-III. Камэнтыруючы працэс Грамады, «Известия» пішуць:

Якія-б бліскучыя прамовы ні гаварылі абаронцы, лёс абвінавачаных на працэсе Беларускай Грамады залежыць не ад красамоўства адвакатаў, а ад таго, якая плынь па гэтаму пытаньню пераможа ў польскіх урадавых колах.

Справа ў тым, што сярод пілсудчыкаў па гэтым пытаньні існуюць два пункты гледжаньня: адзін лічыць неабходным пакінуць у моцы драконаўскі прысуд першай інстанцыі, а другі схіляецца к таму, каб яго зьмякчыць, спадзяючыся такім чынам прымусіць лідараў Грамады пайсьці па шляхох былых таварышоў Астроўскага і Луцкевіча, якія адкрыта пашлі на паслугі ўраду.

Абедзьве плыні сярод пілсудчыкаў, разыходзячыся ў пытаньнях тактыкі, у асноўным імкнуцца да аднае мэты: ліквідаваць вызваленчы рух беларускага народу.

Белы тэрор у Польшчы пашыраецца.

ВАРШАВА, 9-3. У Таркове (Заходняя Украіна) суд прысяжных слухаў справу 4-х асоб, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці.

Суд засудзіў 3-х чалавек на 4 гады строгу кожнага і аднаго—на 3 гады.

Пры чытаньні прысуду адзін з засуджаных падбег да судоваца стала і пагражаючы кулакамі з абурэньнем выгукнуў: «Настане час, калі вам будзе дадзен належны адказ на белы тэрор».

ПРЫЧЫНЫ САМАГУБСТВА ЖОНКІ ЛУЦКЕВІЧА.

ВАРШАВА, 9-3. Газэта „Фольксцэйтунг" паведамляе, што самагубства жонкі Луцкевіча шчыльна зьвязана з палітычнаю здрадаю яе мужа.

Як вядома, Луцкевіч зьмяніў свае палітычныя пераконаньні і перайшоў у лягер польскае санацыі (пілсудчыкі). У радыкальных беларускіх колах пачалі адносіцца пасьля гэтага да Луцкевіча са зьнівагаю і ўхіляліся ад спатканьня з ім. Гэта врабіла вялікі ўплыў на яго жонку. Яна ня вытрымала гэтае ганьбы і скончыла свё жыцьцё самагубствам.

Фашызм пад абстрэлам рабочых партый

ВЕНА, 8-3. Як паведамляюць з Сафіі (Баўгарыя), у зьвязку з адчыненьнем 9-га сакавіка ў Бэрліне антыфашыскага кангрэсу, у вялікіх баўгарскіх гарадох заснаваны антыфашысцкія камітэты, у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі рабочае партыі, саюзу моладзі рабочае партыі, цэнтрысцкага сялянскага саюзу, незалежных прафсаюзаў, саюзаў пралетарскіх пісьменьнікаў і г. д. У Сафіі і ў іншых правінцыйных гарадох гэтыя камітэты наладжвалі масавыя сходы.

Пахаваньне Ямамоты.

Выступаўшыя прамоўцы ганьбілі рэакцыйны характар габінэту Танакі.

ТОКІЁ, 8-3. Адбылося пахаваньне забітага пралетарскага дэпутата Ямамота. Пахавальную працэсію абкружаў атрад паліцэйскіх. На пахаваньні прысутнічалі прадстаўнікі пралетарскіх партый, прафсаюзных арганізацый, некаторыя дэпутаты, у тым ліку некалькі буржуазных, і г. д. Выступаўшыя прамоўцы ганьбілі белы тэрор і падкрэсьлівалі рэакцыйны характар габінэту Танакі. Прамоўцаў некалькі разоў перапыняла паліцыя, якая рабіла спробы арыштаваць прамоўцаў, але няўдачна, з прычыны адпору прысутных на пахаваньні.

Амністыя ў адзнаку 10-цігодзьдзя БССР

вайсковым служачым і працоўным, засуджаным ваенным трыбуналам.

Пастанова прэзыдыуму ЦВК СССР

Распаўсюдзіць пастанову ЦВК СССР ад 1-га студзеня 1929 г. аб амністыі ў адзнаку 10-цігодзьдзя існаваньня БССР на вайсковых служачых і іншых працоўных, засуджаных ваенным трыбуналам за злачынствы, ўчыненыя на тэрыторыі БССР.

Прапанаваць ЦВК БССР:

1. Вызваліць усіх вайсковых служачых часьцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР, ад узысканьняў, накладзеных на падставе правіл дысцыплінарнага статуту Рабоча-Сялянскае Чырвонае армії.

2. Вызваліць з пад варты ўсіх вайсковых служачых, якія ўпяршыню былі засуджаны ваеннымі трыбуналамі за злачынствы, ўчыненыя на тэрыторыі БССР, да пазбаўленьня волі на тэрмін да 6-ці месяцаў уключна, і засуджаных на прымусовыя работы на тэрмін да году.

3. Вызваліць з пад варты ўсіх вайсковых служачых і іншых працоўных, упяршыню засуджаных ваеннымі трыбуналамі за злачынствы, ўчыненыя на тэрыторыі БССР да пазбаўленьня волі на тэрмін ад 6-ці месяцаў да 3-х гадоў, калі яны адбылі палову тэрміну вызначанага прыгаворам трыбуналаў.

4. Вызваліць ад дадатковых мер сацыяльнае абароны ў тым ліку ад пазбаўленьня правоў поўнага ці частковага ўсіх вайсковых служачых і працоўных, засуджаных упяршыню ваенным трыбуналам за злачынствы, ўчыненыя на тэрыторыі БССР, да пазбаўленьня волі на тэрмін да 3-х гадоў уключна ці да больш лёгкае чым пазбаўленьне волі меры сацыяльнае абароны.

5. Спыніць ва ўсякай стадыі працэсу справы аб злачынствах, якія ўпяршыню ўчынены вайсковымі служачымі і іншымі працоўнымі на тэрыторыі БССР, калі гэтыя справы падсудны ваенным трыбуналам і калі адпаведныя артыкулы крымінальнага кодэксу БССР мерамі сацыяльнае абароны ўстаноўлена пазбаўленьне волі да 6-ці месяцаў уключна і прымусовыя працы да аднаго году.

6. Гэтае пастановы аб амністыі не распаўсюджваць на ўсіх вайсковых служачых і іншых працоўных, засуджаных ваеннымі трыбуналамі за злачынствы, ўчыненыя на тэрыторыі БССР, хоць і ўпяршыню, але на тэрмін больш 3-х гадоў пазбаўленьня волі, актыўных сяброў палітычных груповак, якія імкнуцца скінуць падарваць і паслабіць уладу саветаў, шпіёнаў, кантрабандыстаў, бандытаў, хабарнікаў, растратчыкаў, якія ўчыняюць падлогі, падпальшчыкаў, канакрадаў, учыніўшых гвалтаваньне, а таксама непрацоўны элемэнт і рэцыдывістаў, хоць і непрыналежных да складу Рабоча-Сялянскае Чырвонае армії, але засуджаных ваеннымі трыбуналамі за злачынствы ўчыненыя на тэрыторыі БССР.

7. Гэтая пастанова аб амністыі павінна быць выканана да 15-га красавіка 1929 г.

Старшыня Усерасейскага ЦВК СССР КАЛІНІН.

За сэкратара Усерасейскага ЦВК СССР ТАЛАКОНЦАЎ.

Масква, Крэмль 8-га сакавіка 1929 г.

Неабходна правільна выкарыстаць унутраныя рэсурсы.

(З ПАСТАНОВЫ САВЕТУ ПРАЦЫ І АБАРОНЫ).

Агалошана пастанова Савету Працы і Абароны аб правільным выкарыстаньні ўнутраных рэсурсаў дзяржаўных прадпрыёмстваў. У пастанове зазначаецца, што абставіны сёлетняга гаспадарчага году ставяць асабліва востра задачу поўнага ажыцьцяўленьня гаспадарчых і фінансавых плянаў. Пры гэтых умовах мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці павінна разгінданца, як адна з важнейшых задач і правядзіцца настойліва і неадкладна. У адпаведнасьці з гэтым Савет Працы і Абароны пастанавіў: Абавязаць ВСНГ СССР і НК Шляхаў у працягу 1928-29 г. мабілізаваць на складах прамысловасьці і транспарту ўсе лішкі запасаў сыравіны, матар'ялаў і паўфабрыкатаў, у агульным на суму ня менш 250 мільёнаў рублёў. Гэтая сыравіна, матар'ялы і паўфабрыкаты павінны пайсьці на патрэбы капітальнага будаўніцтва, для задаволеньня шырокага рынку і пасьпешнаньня дастаўкі самой прамысловасьці і транспарту. ВСНГ даручана супольна з НК РСІ ў 2-хтыднёвы тэрмін устанавіць, у яких менавіта прамысловых трэстах, у якіх разьмерах і ў якія тэрміны павінна быць праведзена спамянёная мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў. Эканамічным саветам (нарадам) саюзных рэспублік прапанавана ўжыць захады, у адпаведнасьці з гэтай пастановай, да мабілізацыі лішкаў запасаў сыравіны, матар'ялаў і паўфабрыкатаў на складах прадпрыёмстваў рэспубліканскага і мясцовага значэньня.

Ход пасеўнай кампаніі.

ЗАХАДЫ СНК СССР ДА ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЕДАХОПАЎ У ГЭТАЙ КАМПАНІІ

МАСКВА, 8-3. Упаўнаважаны саюзнага ўраду па правядзеньні вясеньняй пасеўнай кампаніі т. Рудзутак Я. Э., дакладваючы нядаўна на пасяджэньні саюзнага СНК аб ходзе гэтае кампаніі, між іншым адзначыў недастатковую ўвагу ў ВСНГ СССР да пытаньня аб разьвіцьці вырабу запасных частак да трактараў, недастатковую дастаўку на Варонескі трыерны завод мэталю і шэраг іншых недахопаў, якія могуць уплыць адмоўна на выніку надыходзячай вясеньняй пасеўнай кампаніі. Зараз Саюзны СНК ужыў шэраг захадаў, накіраваных да зьнішчэньня ўсіх гэтых недахопаў і да забясьпечаньня пасьляховага правядзеньня вясеньняе пасеўнае кампаніі, як у адносіне пашырэньня пасеўных плошчаў, так і ў адносінах павышэньня ўраджайнасьці і найбольш поўнага выкарыстаньня сельска-гаспадарчых машын і трактараў у пасеўнай кампаніі. Эканомкрадзе саюзных рэспублік прапанавана абавязкова абавяцаць мясцовым органы зьвярнуць увагу на максымальнае забясьпечаньне кантрактуемых у сёлетнім годзе плошчаў аграданамогай і на ўзмацненьне ролі ў кіраўніцтве кантрактацыяй земельных органаў. Адначасова з гэтым, мясцовыя органы сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту і сельска-гаспад. крэдытнае каапэрацыі пры выдачы пазык павінны вымагаць ад заёмчыка абавязковага пашырэньня пасеўнае плошчы і ўжыцьця захадаў да зьвяньшэньня ўраджайнасьці.

НАФТА І ПАЛІТЫКА.

Згода, утвораная паміж Нафтасындыкатам СССР і ангельскім нафтавым трэстам «Роял Дэтш» (і іншымі ангельскімі трэстамі), выклікала вялікі шум у буржуазнай Эўропе. Згода стаіць у цэнтры ўвагі ўсяго эўрапейскага друку. Яе ўзмоцнена абгаварваюць палітыкі і банкіры. Усеагульнае зьдзіўленьне выклікае ўвільваючая заява кіраўніка «Роял Дэтш».

Сур'ёзная трывога панае сярод нямецкіх прамыслоўцаў.

Аднак, ня гледзячы на рознастайныя водгукі і настроі капіталістычных груп, усе яны—і водгукі настроі—аднолькава пацьвярджаюць, што нафтавая згода зьяўляецца буйным эканамічным і палітычным посьпехам СССР.

Перш усяго згода зьявілася вельмі важкім і пераконваючым выкрыцьцём той хлусьні аб становішчы ў СССР, якою наёмныя пісакі „Роял Дэтш" у працягу некалькіх гадоў марочылі Эўропу (і ня толькі Эўропу). «Кіраўнікі нашай нафтавай прамысловасьці так часта ўпэўнялі, што з СССР ніякіх спраў мець немагчыма,—піша ангельская буржуазная газэта «Фінансіяль Таймс». Між тым зараз ясна, што ў сапраўднасьці становішча іншае".

Яшчэ больш выразна гаворыцца ў артыкуле, агалошаным уплывовым нямецкім тэлеграфным агэнцтвам, якое абараняе інтарэсы прамыслоўцаў.

„Нафтавая згода,—заяўляе аўтар артыкулу,—ніколі-б ня была ўтворана, калі-б былі верны шматлікія трывожныя (іншымі словамі—паклёпніцкія) паведамленьні аб становішчы ў СССР.

Згода прымушае зрабіць вывад, што ў савецкай гаспадарцы хаваюцца вялікія і трывалыя магчымасьці".

Іншымі словамі. Дэтэрдынг, кіраўнік трэсту «Роял Дэтш», сам сябе выкрыў. Натуральна, што нават гэты шмат бачыўшы на сваім веку міжнародны дзялец адчувае сябе крыху няпрыемна і сьпяшаецца замазаць свае мімавольныя выкрыцьці. Адгэтуль і яго ўвільваючая заява, якою Дэтэрдынг спрабаваў стварыць ураўнаньне, быццам яго згода з Нафтасындыкатам СССР ня мае асаблівага значэньня.

Аднак, стварыць такое ўраўнаньне яму ніяк не ўдалося. Перашкодзілі відавочныя для ўсіх факты. Бо, пачынючы з 1924 году, Дэтэрдынг вядзе лютую барацьбу супроць савецкае нафты, імкнецца выціснуць яе з ангельскага рынку, дамагаецца для гэтага англа савецкага разрыву. А праз паўтара гады пасьля разрыву ён неспадзяна зьмяняе палітыку і ўтварае згоду, водгук якой СССР атрымлівае магчымасьць падвоіць увоз сваей нафты на ангельскі рынак. Ясна, што тут—адступленьне, паражэньне Дэтэрдынга.

Па сутнасьці гэта іменна і прызнае ангельская буржуазная газэта «Фінансіяль Ньюс», калі яна піша, што згода з Нафтасындыкатам выклікала нездаволеньне сярод кіраўнікоў так званага «камітэту крэдыторaў Расеі» (царскае Расеі). Зразумела, «камітэт крэдыторaў» і ня можа быць задаволен. Гэта-ж супроцьсавецкая арганізацыя дамагаецца крэдытнае, ды ня толькі крэдытнае блёкады СССР. Між тым сучасная нафтавая згода бязумоўна зрывае ўсякія блёкадныя пляны.

Кіраўнікі «камітэту крэдыторaў» маюць рацыю, калі скардзяцца, што Дэтэрдынг, проста кажучы, напляваў на іх «камітэцкія» інтарэсы. Аднак, неабходна памятаць, што гэты самы „Камітэт крэдыторaў" быў утворан ні кім іншым, як Дэтэрдынгам. Дэтэрдынг аб'яднаў крэдыторaў і імкнуўся заручыцца іх падтрыманьнем усё в тою-ж мэтаю арганізацыі блёкады савецкае нафты і выпханьня яе з ангельскага рынку. І калі цяпер сам Дэтэрдынг падрывае працу ім жа арганізаванае арганізацыі, дык ясна, што, прынамсі, бліжэйшыя мэты яго палітыкі зьмяніліся, што ён прымушан адступіць у сваёй доўгай барацьбе супроць савецкае нафты.

Але кожнаму вядома, што суровая супроцьсавецкая палітыка Чэмбэрлена і ўсяго сучаснага ўраду Англіі ў вельмі значнай ступені тлумачыцца нажымам магутнага дэтэрдынаўскага трэсту «Роял Дэтш». Натуральна, што «прымірэньне» Дэтэрдынга з нашым Нафтасындыкатам выклікае на сторонках эўрапейскага друку шматлікія меркаваньні наконт магчымага агульнага палепшаньня англа-савецкіх дачыненьняў.

Гэткія меркаваньні многіх сур'ёзна непакояць. Польская фашысцкая ваенчына баіцца, як бы Англія наогул не адмовілася ад супроцьсавецкай палітыкі і як бы ў гэтым выпадку не аказалася бессэнсоўна і супроцьсавецкая палітыка Польшчы. Нямецкія прамыслоўцы ўстрывожаны магчымым адраджэньнем англа-савецкага гандлю і, значыць, паяўленьнем на савецкім рынку ангельскага канкурэнта.

Артыкул нямецкага тэлеграфнага агэнцтва, аб якім ужо спаміналася, проста папярэджвае, што «разьвіцьцё дачыненьняў паміж СССР і Англіяй, паміж СССР і Амэрыкай зьяўляецца для Нямеччыны трывожным сыгналам. Нямеччына можа аказацца выцесьненай з савецкага рынку».

Што-ж прапануе артыкул, каб гэтага ня здарылася?

Яго прапанова заслугоўвае асаблівае ўвагі. Яна датычыць г. зв. «расейскага камітэту», які быў заснован мінулай восеньню буйнейшымі аб'яднаньнямі нямецкіх прамыслоўцаў і які прызначан для кіраўніцтва ўсімі нямецкімі фірмамі пры падпісаньні імі зьдзелак з СССР. Мы в самага пачатку зазначалі, што „расейскі камітэт" і яго «кіраўніцтва» могуць толькі пашкодзіць нямецка-савецкаму гандлю, па колькі ў склад камітэту ўвайшлі й прадстаўнікі прамысловых груп, варожых зблiжэньню з СССР. Нямецкі друк, наадварот, да апошняга часу ўсялякім чынам бараніў камітэт, А вось памянёны артыкул пераходзіць на наш пункт гледжаньня і выступае супроць «расейскага камітэту»...

Нафтавая згода выклікала ўжо, як бачым, некаторы рух у эўрапейскай палітыцы. Паглядзім, што будзе далей.

І. С.

Будаўнічыя работы на першай раённай электрастанцыі імя тав. Сталіна.

ЗВЫШ 7 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ СЁЛЕТА БУДЗЕ ЗАТРАЧАНА НА РОЗНАЕ БУДАЎНІЦТВА СТАНЦЫІ.—ПАМІЖ ВІЦЕБСКАМ І СТАНЦЫЯЙ ПРАВОДЗЯЦЦА ТРАСЫ НА ДАЎЖЫНІ Ў 60 КІЛЁМЭТРАЎ.—ПЕРШЫ ТОК СТАНЦЫЯ ДАСЬЦЬ У САКАВІКУ 1930 ГОДУ.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам Намесьнік Галоўнага Інжынэра Станцыі т. Шаршнёў аб ходзе падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону на станцыі паведаміў наступнае.

— Зараз шырока разгарнуліся работы па загатоўцы розных будаўнічых матар'ялаў. Мы закончылі загатоўку 500 куб. саж. каменя; загатоўлена 13.000 бярвеньняў, якія прызначаюцца для правядзеньня высокавольтнай лініі паміж Віцебскам і Арэхамі. У сакавіку мы шырока разгарнулі працу па драбленьню каменя. Закончылася загатоўка пяску. Заказана 13.000 бочак цэманту, які ўжо пачаў прыбываць. Станцыя мае ўжо да паўтара мільёна цэглаў. Маем таксама некаторыя запасы мядзянага дроту для праводкі.

Станцыя своечасова пачала падрыхтоўку, каб з вясны распачаць торфараспрацоўкі, дзеля гэтага з Разанскай губ. запрашаюцца 300 высокакваліфікаваных рабочых, рэшта рабочых—да 500 чалавек—будуць набраны ў межах Беларусі.

Па загатоўцы торфу сёлета будуць працаваць 8 машын замест 6 леташніх. Усяго сёлета мяркуецца загатовіць да 2.600.000 пуд. торфу. Усяго на станцыі будзе працаваць у гэтым сэзоне да 3.000 чалавек.

Мы вядзём актыўную падрыхтоўку да правядзеньня лініі. Праводзіцца прарубка трас на даўжыні ў 60 кілёмэтраў да гораду Віцебска, прычым лесам лінія ідзе каля 25 кілёмэтраў. У сучасны момант працуе 200 рабочых, якія забіваюць палі на балотах, рэках і інш. балоцістых мясцох, на якіх будуць замацоўвацца слупы. Адначасова з гэтым па ўсёй лініі разводзяцца слупы, каб можна было ўстаноўку іх скончыць да наступнай восені.

На самай станцыі ў працягу гэтага месяца будзе закончана ўстаноўка арматуры на галоўным будынку станцыі. Заказана на замежных прадпрыёмствах на 900.000 руб. высокавольтнае абсталяваньне і на гэткую-ж суму грошай заказана абсталяваньне на заводах ГЭТ.

Сёлета будаўнічы сэзон пачнецца з раньняй вясны, дзякуючы чаму мы мяркуем поўнасьцю выканаць будаўнічы плян.

Вядзецца вялікая падрыхтоўка да пабудовы 3-хпавярховага дому на 100 кватэр, лазьні-пральні, катэджу і школы.

Станцыя вядзе падрыхтоўку да прыёму току на мясцох. Мы правялі абсьледваньне каля Віцебску 5 трас, 69 пунктаў і 1000 сялянскіх двароў. Вядзецца загатоўка слупоў. Дзеля электрыфікацыі сельскай гаспадаркі станцыя адпускае 60 тон дроту, а земпляп Наркамзему вызначыў на гэту справу 120.000 руб. Але трэба адзначыць, што гэта пытаньне пакуль што ня вырашана ў Прэзыдыуме Дзяржпляну БССР, што затрымоўвае падрыхтоўку да правядзеньня электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Адначасова з гэтым вядзецца падрыхтоўка да прыёму току адпаведнымі прамысловымі прадпрыёмствамі. Для ўсіх фабрык і заводаў заказаны маторы на заводах ГЭТ. Станцыя ўзьняла хадайніцтва, каб заказы на маторы былі выкананы ў тэрмін. Праз Беларускае аддзяленьне ГЭТ арганізаваны ў Віцебску апарат з 155 канцэраў для праводкі электрычнасьці на фабрыках і заводах. Пытаньне гэта вельмі тэрміновае, і ўсе дырэктары прамысловых прадпрыёмстваў Віцебску павінны тэрмінова заключыць дагаворы з ГЭТ'ам і зрабіць усе заказы.

На ўсё будаўніцтва станцыі сёлета мае быць выдаткавана звыш 7 мільёнаў руб.

Адміністрацыя станцыі сёлета як сьлед разгарнула працу па загатоўцы розных спажывецкіх прадуктаў. Так, мы загатовілі сёлета 13.000 пуд. хлеба, што забясьпечыць усе нашы патрэбы.

К. І.

НА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Агляд працы вытворчых нарад праходзе нездавальняюча.

Гомель, 8-3. На шмат якіх прадпрыёмствах акругі агляд працы вытворчых нарад закончвецца. Аглядваньня камісіі пачынаюць падрахоўваць вынікі агляду. Вынікі будуць абмяркоўвацца на сходах рабочых. Вялікія вынікі маюцца на галоўных майстэрнях. Агляд выявіў сапраўдную актыўнасьць усіх рабочых. У майстэрнях паступіла 1700 прапаноў, у Палесьпруку 400, на лесазаводзе «Колтрух»—337. На чыгунцы і ў Палесьпруку ход агляду шырока асьвятляўся, шляхам выпуску спэцыяльных друкаваных газэт.

Аднак ня ўсюды ўтвораны спрыяючыя абставіны для працы агляду. На некаторых прадпрыёмствах кіраўнічыя арганізацыі ня ўлічвалі значэньня агляду і прынялі яго ход. На прадпрыёмствах па саюзах камунальнікаў, транспартнікаў, нарпіт, рабіс, сельска-гаспадарчых рабочых, воднікаў, аглядавая праца яшчэ не распачыналася. Па саюзу харчавікоў агляд пачаўся толькі 17-га лютага і праходзіць вельмі павольна. Не адчуваецца агляд на хлебапякарні ЦРК, на млыве і на інш. Скліканыя на гэтых прадпрыёмствах вытворчыя нарады па агляду не адбыліся. Акруговае праўленьне саюзу яшчэ да гэтае пары ніякіх указаньняў не дало.

Вельмі слаба разгортваецца агляд на прадпрыёмствах саюзу гарбарнікаў, шэйнікаў, металістаў. Мы маем у наяўнасьці безадказнасьць і неразуменьне палітычнае задачы аглядаемае працы. На заводзе «Пролетарый»—агляду ўвагі не зьвяртаецца. Выдзеленыя камісіі яшчэ не распачалі працы. Партячэйка, заўком, адміністрацыя заводу ня цікавяцца аглядам. На заводзе „Інтэрнацыянал" у Рэчыцы ў склад агляднае камісіі ня ўведзена ніводнага дарослага рабочага. На фабрыцы „Днепр" агляд праходзіць слаба. Старшыня завкому лічыць лішнім свой удзел у аглядзе. З старшыні бяруць прыклад працаўнікі інжынэрна-тэхнічнае сэкцыі фабрыкі. На фабрыцы «Везувій» таксама няма асаблівае раскачкі.

На ходзе агляду адбіваецца няўдзел інжынэрна-тэхнічных сіл, недастатковы ўдзел гаспадарнікаў. Некаторыя гаспадарцы нават так разважаюць: «Гэта праца прафсаюзаў, а ня наша». На некаторых прадпрыёмствах ня ўзьвялічаюць асобныя групы. На фабрыках «Везувій», «Гэрой Працы», „Днепр", дзе большасьць работніц, апошнія адносяцца індыферэнтна да агляду.

Рабкоры, якія павінны былі вар'ціць увагу грамадзкасьці на становішчы аглядаемае працы на шэрагу прадпрыёмстваў ня ўзьвялічаюць у аглядзе.

Клюбы амаль таксама не вядуць ніякае працы па разгортваньні вытворчых нарад. Праўда, часткова гэта тлумачыцца тым, што клюбы былі заняты перавыбарчай кампаніяй гарадзкоў, але трэба зараз пры падсумаваньні вынікаў дагнаць прапушчанае. У бліжэйшы час акрпрафсавет склікае канфэрэнцыю для падрахаваньня вынікаў агляду і выпрацоўкі мерапрыёмстваў па паляпшаньні працы вытворчых нарад.

САМААБКЛАДАНЬНЕ ПРЫНЯТА Ў 1000 ВЁСКАХ АКРУГІ.

ГОМЕЛЬ, 9-III. На 1 сакавіка самаабкладаньне прынята ў 1000 вёсках акругі на 230.825 р. Самаабкладаньне засталася правесьці яшчэ ў 839 вёсках. У Лоеўскім раёне самаабкладаньне праведзена ва ўсіх насельніцкіх пунктах. У некаторых раёнах пачалі паступаць сумы па самаабкладаньню. Так, у Брагінскім раёне паступіла 500 руб., у Церахоўскім—700 р., Хойнікскім—823 р., Лоеўскім—738 р. і ў Камарынскім—995 р.

Пашыраецца агнятрывалае будаўніцтва.

(Ліст з Бабруйску).

У бягучым годзе на Бабруйшчыне будуць праведзены значна большыя будаўнічыя работы. У шасьці раёнах акругі (Рагачоўскім, Жлобінскім, Парыцкім, Глускім, Чырвона-Слабодзкім, Слуцкім і Бабруйскім) будзе пабудавана 9 будынкаў пад школы з агнятрывалых матар'ялаў. Апрача таго ў Старобінскім раёне вызначана пабудова агрупункту і ў Сьвіслацкім і Асіпавіцкім раёнах—вэтпункты.

Але гэта ня ўсё. Сёлета Бабруйшчына ўпяршыню прыступае да агнятрывалага будаўніцтва ў савгасах і калгасах, прычым гэтае будаўніцтва для першага году зьяўляецца даволі вялікім. У савгасе Забалацьце, Рагачэўскага раёну, у савгасе Боркі, Чырвона-Слабодзкага раёну, Рачковічы, Слуцкага раёну і Пагост, Старобінскага раёну будзе пабудавана некалькі шматкватэрных жылых дамоў і некалькі хлявоў. У калгасах 9 раёнаў акругі будзе пабудавана 20 агнятрывалых жылых дамоў.

Што дадычыцца чыста сялянскага агнятрывалага будаўніцтва, дык сёлетні год дасьць значнае пашырэньне гэтай работы супроць мінулага году. Калі за леташні год сялянствам было пабудавана толькі 35 будынкаў з агнятрывалых матар'ялаў, дык сёлета іх будзе пабудавана 56.

Значную ролю на вёсцы адыгрывае пабудова бэтонных студняў. Па пляну на бягучы год іх вызначана пабудаваць 200, але практыка мінулых год гаворыць аб тым, што гэтая лічба будзе далёка перасягнута. Сёлета па Бабруйшчыне будзе ўпяршыню прыступлена да пабудовы буравых студняў на вёсцы, чаго да гэтага часу ня было.

У справе каапэраваньня сялянства навокал агнятрывалае справы мяркуецца арганізаваць 8 новых агнятрывалых таварыстваў.

На ўсё гэтае агнятрывалае будаўніцтва адпушчаюцца значныя сумы крэдытных сродкаў: на будаўніцтва ў калгасах—91400 руб., на сялянскае будаўніцтва—40 тыс. руб.; на выраб матар'ялу (для агнятрывалых таварыстваў)—48 тыс. руб. і на пабудову студняў—13 тыс. руб. Значная доля гэтых крэдытаў—доўгатэрміновыя.

Характарызуючы падрыхтоўку да будаўнічага сэзону на мясцох трэба сказаць, што Парыцкі, Бабруйскі і Жлобінскі раёны не праводзяць добра. Што-ж датычыцца Рагачэўскага раёну, дык ён, на прыкладу мінулага году (аб чым пісалася ў «Савецкай Беларусі») не зьвяртае на гэту справу належнай увагі і цягнецца ў хвасьце.

А. Дамброўскі.

Каапэрацыйная кіноперасоўка.

Праўленьне Стара-Дароскага спажывецкага т-ва атрымала ад Слуцкага аддзяленьня кіно-перасоўку, якая будзе працаваць у раёне дзейнасьці Стара-Дароскага, Залускага і Жыціна-Шчыткаўскага спажывецкіх т-ваў. Гэта будзе самае лепшае і карыснае скарыстаньне 20 проц. культфонду.

Абрамовіч А.

Растратчык спаліў каапэратыў.

Гомель, 9-3. У вёсцы Шарпілаўка старшыня спажывецкага таварыства Мядзьведзеў падпаліў каапэратыўную лаўку. Пажарам зьнішчана тавараў на 5000 руб. Падпал зроблен з мэтай схаваньня сьлядоў растраты каапэрацыйных грошай. Мядзьведзеў затрыман. Насельніцтва ўзьняло хадайніцтва перад судом аб пакараньні растратчыка-падпальшчыка.

КАЛЕКТЫЎНА ЗДАЁМ ХЛЕБ.

Грамадзяне вёскі Жольвінцы, Глускага раёну, Бабруйскай акругі, калектыўна здалі дваццаць пудоў хлеба ў Гарадкоўскае крадытнае таварыства. Малая колькасьць зданага хлеба тлумачыцца тым, што вёска бедная. Наша вёска гэта ўжо другі раз здае калектыўна хлеб. Здаючы хлеб, сяляне казалі, што кожны пуд зданага жыта будзе біць па прыватніку і спекулянту.

В. Мішур.

ПРАВОДЗІМ МЭЛІАРАЦЫЮ.

Ворша, 9-3. У гэтым годзе па акрузе будуць праведзены значныя работы па мэліярацыі. Першым чынам будзе праведзена рэгуліроўка рэчак Раківаўкі, Чэрніцы, Халастоўкі і Аршыцы, без чаго, немагчыма распачаць працу па асушцы балот і сялянскіх лугоў пры гэтых рэчках. На рэгуліроўку рэчак дзяржавай будзе затрачана 91.255 руб.

Далей будзе асушана балота лясного фонду ў Горацкім лясьніцтве, плошчаю ў 225 гэкт., на што будзе затрачана 20.000 руб. Пасьля асушкі, гэта балота будзе перадана лясной вопытнай станцыі. Акрамя гэтага будзе праведзена асушка балот і лугоў на зямлі мэліярацыйных таварыстваў на плошчы ў 3.300 гэкт., на што будзе затрачана 97.125 р. Таксама на дзяржаўных сродкі будуць зроблены вышуканьні на плошчы 6200 гэкт. і за кошт насельніцтва-мэліярацыйных таварыстваў на плошчы—5000 гэкт.

Рэгуліроўка рэчак дасьць магчымасьць асушыць плошчу ў 6000 гэкт., якая будзе перадана пад сельска-гаспадарчае карыстаньне і плошчу ў 6000 гэкт. для здабываньня торфу для дзяржаўнае электрастанцыі імя Сталіна.

А. Мілашэўскі.

Курсы для загадчыкаў дзіцячых ясьляў.

ВОРША, 9-3. Каб шырэй разгарнуць сетку дзіцячых ясьляў у акрузе і каб даць у ясьлі добрых працаўнікоў, арганізуюцца месячныя курсы для падрыхтоўкі загадчыкаў ясьлямі. На гэтых курсах будзе вучыцца 30 чалавек. Акрамя таго, што будуць арганізаваны новыя ясьлі, у гэтым годзе будзе таксама праведзена праца і па замацаваньню ясьляў, існаваўшых у мінулым годзе. Асабліва зьвяртаецца ўвага на значнае пашырэньне сеткі дзіцячых ясьляў у савгасах і калгасах. Сродкі на ясьлі павінны быць адлічаны ад прыбытку, яльбо з культфондаў.

Арганізацыя новых калектываў.

Барысаў, 8-3. У бягучым годзе ў час пасэўкампаніі намечан плян арганізацыі пры кожным с.-с. калектываў, з якіх ужо 15 арганізавана. Будзе арганізавана 3 пасялковыя т-вы, 6 машынных і адна малочная арцель. У гэтым-жа годзе будзе пераведзена 2600 гэктараў зямлі на шматпольле.

Шынкарства ў Барысаве.

Барысаў, 6-3. За апошні час у Барысаве значна распаўсюджваецца шынкарства. Шэраг жыхароў Барысаву адкрыта гандлююць гарэлкай, асабліва ў рабочых раёнах. Ёсьць шэраг жыхароў, якія ў працягу 5-6 год займаюцца шынкарствам, аднак ніякай барацьбы з гэтай хваробай не вядуцца. З боку міліцыі поўная нядбайнасьць зьнішчэньня гэтых зьявішчаў. Рабочыя прапіваюць сваю пэнсію. Неабходна належным установам гэтым зацікавіцца, бо міліцыя ніякіх мер ня прымае.

ПАГРОЗА ЗРЫВУ „ДВУХТЫДНЁВІКА АШЧАДНАСЬЦІ".

Дасягнутыя па БССР да гэтага часу вынікі кампаніі за ўзмацненьне ашчаднай справы зьяўляюцца вельмі нездавальняючымі і недастатковымі.

З 1-і да 1-III па БССР уцягнута ўсяго 752,5 тысяч рублёў, што складае толькі 29,1 проц. кантрольнага заданьня, якое павінна быць выканана да 1 красавіка.

Аналіз вынікаў кампаніі па асобных акругах дае вельмі нездавальняючы малюнак. Так, Полацкая акруга выканала толькі 15 проц. заданьня, Магілеўская і Менская—20 проц., Гомельская 21,9 проц., Віцебская 36 проц.

Зусім недапушчальнае зьявішча мы наглядаем у Мазырскай і Аршанскай акругах, у якіх мы за пэрыяд часу з 1 студзеня да 1 сакавіка маем нават адліў укладчыкаў. Праўда, у Аршанскай акрузе быў кароткі момант, калі яна па тэмпу разгортваньня кампаніі высунулася наперад, але, узяўшы ўвесь пэрыяд кампаніі, мы маем у ёй самае дрэннае становішча.

Найлепей вядзе працу Бабруйская акруга, якая выканала на 1-III 67,4 проц. заданьня.

Вышэйпрыведзеныя лічбы сьведчаць аб адсутнасьці сур'ёзнага падыходу да кампаніі з боку большасьці акруг, аб тым, што няма кіраваньня і нагляду за ходам кампаніі з боку кіруючых акруговых і раённых органаў, аб тым, што месцы не ацэньваюць адказнасьці за посьпех гэтай важнай палітычнай кампаніі.

Карэньні такога нездавальняючага становішча ўпіраюцца ў бязьдзейнасьць акруг у часе падрыхтоўчага пэрыяду. Найбольш яскравым пацьвярджэньнем гэтага зьяўляецца факт адліву ўкладаў на працягу студзеня і лютага ў шэрагу округ: у Гомельскай акрузе за студзень ёсьць зьмяншэньне ўкладаў на 21,4 тысячы руб., у Менскай—на 4 тысячы руб., у Мазырскай—на 11,3 тысячы руб., у Аршанскай—на 76,7 тысяч руб.; нават за люты месяц сума ўкладаў зьменшылася ў Мазырскай акрузе на 34,3 тысячы руб. і Полацкай акрузе—на 14 тысяч рублёў.

Для такога становішча апраўданьняў няма. Тут мы маем факт самых безадказных і пасыўных адносін з боку дырэктыўных, савецкіх і прафэсыянальных органаў на мясцох. Гэтакае становішча падводзіць нас пад пагрозу зрыву кампаніі «двухтыднёвіка ашчаднасьці».

Для выкананьня заданьня трэба ўцягнуць яшчэ 1.837,7 тысяч рублёў; гэта сума павінна быць акумулявана да 1 красавіка.

Такім чынам, сакавік зьяўляецца найбольш адказным, і ад вынікаў, якія будуць дасягнуты ў ім, залежыць посьпех кампаніі.

Такое становішча высоўвае неабходнасьць дзейнічаць самым рашучым чынам. Адкладваць далей кампанію, праяўляць маруднасьць у тэмпе яе вядзеньня—гэта значыць сарваць кампанію.

Неадкладна трэба ўзяцца за сапраўдную праверку выкананьня дадзеных па ўсіх лініях дырэктыў, правершыць, што зроблена ў округах у выкананьне расправаных планаў, узмацніць удзел саюзных арганізацый у кампаніі, якія да гэтага часу ў ёй слаба ўдзельнічаюць; трэба мабілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці вакол ашчаднай справы; трэба ўзмацніць жывую сувязь з месцамі з такім разьлікам, каб ва ўсе раёны і с-с выехалі кіруючыя працаўнікі для праверкі працы ашчаднага апарату і мясцовых органаў і аказаньня дапамогі ў напрамку больш інтэнсыўнага разгортваньня кампаніі.

Час не чакае, далей адкладваць нельга.

Толькі самае энэргічнае правядзеньне пералічаных мерапрыёмстваў дасьць магчымасьць выканаць заданьні ўраду.

За рашучую рацыяналізацыю вытворчасьці.

(З ПЛЕНУМУ ВСНГ).

З вялікім дакладам аб правядзеньні рацыяналізацыі прамысловасьці выступіў т. Стракоўскі.

— Дзе гады таму назад,—кажа дакладчык,—былі выданы адпаведныя дырэктывы партыйных і савецкіх органаў аб правядзеньні рацыяналізацыі вытворчасьці, але гэтыя пастановы да апошняга часу ня выконваюцца поўнасьцю.

У нашу прамысловасьць штогод укладваюцца значныя сродкі на набыцьцё новых машын і рамонт старых. Толькі ў адным сёлетнім годзе мы ўкладзём на абсталяваньне прамысловасьці каля 9 млн. р. Ня гледзячы на гэта зьніжэньне сабекошту праходзіць незадавальняюча. Мы не дасягнулі яшчэ поўнага выкананьня зьніжэньня сабекошту на 6 проц. Гэта тлумачыцца часткова недахопам сыравіны, падвышэньнем тарыфу перавозак, але мы, аднак, ня вычэрпваем усіх рэсурсаў для зьніжэньня сабекошту. Гэтыя рэсурсы мы маем. Напрыклад, на папяровай фабрыцы ў Добрушы ня выканан нават наш плян аб скарачэньні штату ў 200 лішніх чалавек, на аплату якіх ідзе ў год 120.000 р. Гэтыя грошы складаюць каля 2 проц. у справе зьніжэньня сабекошту.

Мы маем і іншыя рэсурсы, па якіх можна зьнізіць сабекошт. На папчотнай фабрыцы зараз усё новае абсталяваньне, але, ня гледзячы на гэта, сабекошт ня зьніжаецца, у той час як прадукцыйнасьць працы нямецкага рабоч. прыновым абсталяваньні прадпрыёмства павялічваецца ў два разы. Мы не ашчадна выкарыстоўваем апал. Нашы гаспадарнікі не падрыхтаваліся да правядзеньня **калдагаворнай** кампаніі. Яны не падрыхтаваліся да таго, каб вызначыць норму працы. Апроч гэтага, нашы гаспадарнікі не праводзяць шэрагу іншых мерапрыёмстваў, якія дапамагаюць зьніжэньню сабекошту прадукцыі.

Сёлета мы намецілі зьнізіць сабекошт прадукцыі на 7 проц. З 20 млн. руб., якія вызначаны па прамыслова-фінансаваму пляну будаўніцтва прамысловасьці, гэты процант зьніжэньня сабекошту складае 4-5 млн. руб.

Як-жа зараз праходзіць зьніжэньне сабекошту?

Мы бачым, што гэта заданьне ня выконваецца. Фабрыка «Гэрой Працы» зьнізіла на 3 проц., «Чырвоная Зара»—на 2 з палов. процанты, «Спартак»—на 3 проц., абойная фабрыка імя Вароўскага—на 12 проц., а завод «Прафінтэрн» нават падвысіў на 7 проц. і г. д.

Тав. Стракоўскі гаворыць, што ад трэстаў цяжка дабіцца патрэбных вестак аб калькуляцыі. Дакладчык мае рацыю абурацца такімі паводзінамі. Праходзіць доўгі час, калькуляцыя на прадукцыю не складаецца, а бяз гэтага кіраўнікі ня могуць ужыць своечасовых захадаў да зьніжэньня сабекошту.

Пры трэстах няма рацыяналізатарскіх ячэек. Ёсьць трэсты, якія на некалькі год шукаюць рацыяналізатараў. Трэба палепшыць працу лябараторый пры заводах.

Нашы трэсты няўважліва адносяцца да справы вынаходзтва. Ёсьць выпадкі нячулых, нават барбарскіх адносін да вынаходдаў. Трэба выкарыстоўваць кожную спробу ў галіне вынаходзтва.

НА ШЛЯХУ ДА ЗАСНАВАНЬНЯ ГАНДЛЁВЫХ ЗНОСІН МІЖ СССР І АНГЛІЯЙ.

ЛЁНДАН, 8-3. Наконт надыходзячага падарожжа дэлегацыі ангельскае прамысловасьці ў СССР орган фінансавых колаў „Фінансіэль Ньюс" піша: «Нельга ў належнай меры падкрэсьліць важнасьць тае справы, за якую змагаецца дэлегацыя. Хоць яна зьяўляецца неафіцыйнаю, але яе мэта у тым, каб пабудаваць мост, пры дапамозе якога абедзьве краіны ізноў наладзяць афіцыйныя гандлёвыя ўзаемадачыненьні. Сябры дэлегацыі імкнуцца ня толькі атрымаць заказы; яны заснуюць непасрэдны кантакт з савецкім урадам і іх галоўнаю задачаю зьяўляецца ажыцьцяўленьне неабходнае пасрэдніцкае ролі".

* * *

РЭВЕЛЬ, 8-3. У «Постымэст» зьмешчан артыкул Чэрчыля, у якім зазначана, што на надыходзячых парляманцкіх выбарах «краіне пагражае сацыялістычная небясьпека» (г. зн. магчыма перамога рабочае партыі). Спыняючыся далей на пытаньні аб англа-савецкіх дачыненьнях, Чэрчыль заўважае, што ён супярэчыць ня проці гандлю з СССР, а проці аднаўленьня англа-савецкіх дыпляматычных зносін.

РУМЫНСКІЯ С.-Д. НА БАКУ ФАШЫСЦКАГА ЎРАДУ.

ВЕНА, 8-3. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскія сацыял-дэмакраты ў пытаньні аб рэжыме ў Бэсарабіі адкрыта далучыліся да пункту гледжаньня ўраду. Сацыял-дэмакратычны друк узьняў новую кампанію, заявяраючы, што нелегальная дзейнасьць камуністычнае партыі Бэсарабіі палягчае лібэралам агітацыю за аднаўленьне асаднага становішча.

Зачыненьне Тав-ва Беларускае школы.

ВАРШАВА, 9-3. Згодна загаду ваяводы ў Навагрудзкім ваяводзтве зачынена Таварыства Беларускае школы. Усе кніжкі і матар'ялы Таварыства апячатаны.

(«Фольксцэйтунг»).

КРЫЗІС НАСОЎВАЕЦЦА.

(Ліст з Варшавы).

Увесь капіталістычны сьвет, а ў тым ліку і буржуазная Польшча ўступае ў пэрыяд завостраньня клясавых супярэчнасьцяй, абвостраных клясавых боек. Новыя буйныя канфлікты выяўляюцца ў Польшчы нават вастрэй, чымся ў іншых краінах Эўропы, бо Польшча—слабейшае зьвяно капіталістычнае стабілізацыі. Усё ясьней робіцца, што тут твар да твару сустракаюцца дзьве асноўныя сілы: фашызм, які ў агульным і цэлым аб'яднаў у сваім лягеры ўсе заможныя клясы, і—камуністычная партыя Польшчы, якая зьяўляецца гегемонам усіх рэвалюцыйных сіл, што змагаюцца супроць фашысцкай дыктатуры, арганізатарам і правадыром рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту, сялянства і прыгнечаных народаў.

Фашызм можа бясспрэчна адзначыць шэраг дасягнутых ім як у эканамічных, так і ў палітычных адносінах посьпехаў. Але іменна гэтыя посьпехі азначаюць, наколькі гнілая, наколькі нятрывалая стабілізацыя ў Польшчы, іменна гэтыя посьпехі ствараюць базу для новых паглыбленых супярэчнасьцяй, для новых завостраных клясавых сутычак.

Прамысловая вытворчасьць у 1928 г. усё ўзрастае, перавышаючы ўзровень 1927 году на 15 проц., але ўсё-ж агульны ўзровень прамысловае прадукцыі ледзь дасягае даваенных норм. Колькасьць рабочых у прамысловасьці ўзрасла да 950 тыс. чалавек (у 1927 г.—850 тыс.). Беспрацоўе скарацілася (каля 100 тысяч да канца 1928 г.). Бясспрэчна лютая экспляатацыя наёмнай працы і палітыка высокіх цэн (картэліраваньне прамысловасьці, картэлі па экспарту прадуктаў сельскай гаспадаркі) моцна павялічыла прыбыткі капіталістаў і абшарнікаў.

Аднак за апошні час становішча змянілася ў бок вострага нагоршаньня. Насоўваецца прамысловы крызіс. Кан'юнктура апошніх год у нязначнай толькі ступені абумоўлена была ўнутраным накапленьнем, галоўным-жа чынам—прытокам капіталаў з-за граніцы, у першую чаргу з Амэрыкі.

Гэты прыток заграничных крэдытаў у сучасны момант амаль зусім спыніўся. Амэрыканскія банкіры адмаўляюцца даваць грошы, бо агульная палітыка фашысцкай дыктатуры, палітыка адкрытай падрыхтоўкі вайны прымушае баяцца за лёс гэтых грошай. А між тым, прыцягненьне новых доўгатэрміновых крэдытаў звонку зьяўляецца для польскага капіталізму пытаньнем першараднай важнасьці. Можна сказаць, пытаньне жыцьця і сьмерці. Вялікі дэфіцыт гандлёвага балянсу (каля 100 міліенаў даляраў за 1928 г., што для Польшчы зьяўляецца зусім непасільным цяжарам) пагражае раўнавазе разрахункавага балянсу. А выдаткі ўсё павялічваюцца. Толькі на адны патрэбы арміі і флёту (г. зн. на падрыхтоўку вайны) у бягучым годзе прадугледжана каля 1 мілярду злотых (злоты—каля 25 к.) з усяго 3 мілярдавага дзяржаўнага бюджэту, фактычныя-ж выдаткі на армію і флёт будуць яшчэ значна вышэй. Ня маючы магчымасьці атрымаць грошы ў Амэрыцы, польская буржуазія старанна шукае дапамогі на заходняя - эўрапейскім рынку—ў Англіі і ў першую чаргу—у Францыі, але і тут пэрспэктывы далёка невясёлыя. Няма, зразумела, сродкаў і ўнутры краіны — буйнейшыя фабрыкі знаходзяцца ў цяжкім становішчы, бо збыту няма—прадукцыя неправысіла ёмкасьць унутранага рынку. Вучотны процант моцна ўзьняўся, павялічваецца колькасьць апратэставаных вэксалёў.

Моцна нагоршылася і становішча сельскай гаспадаркі. Частковы неўраджай збожжа (на так званых усходніх акраінах, асабліва ў Зах. Беларусі—нават голад) і сур'ёзны неўраджай кармавых траў балюча б'е па сялянскай масе, на серадняках і бедняках. Гэта яшчэ больш скарачае пакупецкую здольнасьць мас.

Такім чынам, насоўваецца прамысловы крызіс. Фашысцкі ўрад шукае ў розных напрамках выхаду з цяжкага становішча. Ён спрабуе павялічыць экспарт, але гэта цяжка зрабіць з прычыны нізкіх цэн на волава, цукер, нафту, а таксама канкурэнцыі на вугольным рынку. Галоўным-жа чынам буржуазея і яе ўрад шукаюць выхаду ў рацыяналізацыі прамысловасьці, ва ўзмацненьні эксплёатацыі наёмнае працы, у павялічэньні падатковага цяжару, які падае на шырокія масы працоўнага насельніцтва.

Але гэтыя мерапрыёмствы ня толькі няздольны стварыць колькі-небудзь надзейны выхад з цяжкасьцяў, але, наадварот, яны завастраюць становішча, выклікаючы глыбокі рух сярод мас. Цэлы шэраг зьявішчаў за апошні час даводзяць, што актыўнасьць пралетарыяту, сялянства і шырокіх мас прыгнечаных народаў узрастае, што іх адпор наступу капіталу ўзмацняецца і пачынае пераходзіць у контрнаступ. Аб гэтым гаворыць нам вялізарная лодзінская забастоўка, аб гэтым гаворыць масавыя выступленьні сялян ня толькі на Зах. Украіне і Беларусі, але і ў карэннай Польшчы. Аб гэтым гаворыць такія падзеі, як падзеі 1 лістапада 1928 г. у Львове, калі украінскія масы далі актыўнейшы адпор польскім фашыстам, граміўшым украінскія дэманстрацыі.

Нарэшце, фашысцкая дыктатура шукае выхаду з цяжкага становішча ў экспансіі на ўсход, іншымі словамі, у падрыхтоўцы вайны супроць СССР. Аб гэтым, зразумела, не гаворыць многа, але ў гэтым напрамку шмат чаго робіцца.

Прамысловасьць наогул знаходзіцца ў цяжкім становішчы—але вайсковая прамысловасьць працуе поўным ходам. Загатаўляецца, а таксама купляецца заграніцай амуніцыя, танкі, аэрапляны і г. д. Рэарганізуецца армія, будуюцца стратэгічныя чыгункі. Шпарка разгортваецца хімічная прамысловасьць для патрэб вайны. Фашысцкі ўрад разгортвае жвавую дыпляматычную дзейнасьць па арганізацыі адзінага фронту супроць СССР. У тым-жа напрамку дзейнічаюць францускія генэралы, якія бязупынна разьязджаюць па Ўсходняй Эўропе. Зразумела, ніхто ня думае, што вымушанае падпісаньне савецкае прапановы аб міры (пакт Келёга) можа колькі небудзь сур'ёзна зьвязаць рукі польскаму ўраду. Гэта, зразумела, ня варуча польскім імпэрыялістам, бо даводзіць польскім масам, што савецкі ўрад вядзе палітыку міру. Але сур'ёзных перашкод для фашызму гэты дагавор ня ставіць.

Такім чынам, у Польшчы набліжаюцца вялікія клясавыя бойкі. Кампартыя Польшчы і пад яе кіраўніцтвам кампартыя Зах. Украіны і кампартыя Зах. Беларусі вядуць масы да гэтых боек. Яна пастоянна выкрывае ўсю палітыку фашызму, а асабліва яго палітыку падрыхтоўкі да вайны; яна змагаецца супроць усіх адкрытых і замаскаваных агентаў фашызму сярод рабочых і сялянскіх мас; яна арганізуе барацьбу мас за іх штодзённыя патрэбы і разгортвае гэту барацьбу ў рэвалюцыйную барацьбу за зьнішчэньне фашысцкае дыктатуры.

Фашызм адказвае на гэта шалёным узмацненьнем тэрору супроць рабочых і сялянскіх мас і іх правадыра—КПП. Тую-ж мэту мае унесены ў сойм фашысцкай партыяй праект рэформы канстытуцыі. У нас няма магчымасьці ў рамках гэтага артыкулу прааналізаваць гэты праект. Галоўнае, што аб ім трэба сказаць, гэта тое, што ён імкнецца надзець новыя ланцугі на рабочых, сялян і прыгнечаныя народы, а з другога боку—ён яшчэ больш, чымся да гэтага часу, палягчае падрыхтоўку вайны супроць СССР, бо ўсе пытаньні адносна замежнае палітыкі і арміі перадаюцца кіраўніку дзяржавы.

Такім чынам, у гэтай галіне фашызм зможа распараджацца яшчэ больш бескантрольна, чымся да гэтага часу. Гэта рэформа канстытуцыі так ці інакш будзе праведзена ў жыцьцё альбо праз сойм, дзе апазіцыя, прыкрываючыся ўсякімі гэстамі, усё-ж падпарадкуецца загаду—альбо, у крайнім выпадку, па-за соймам. Зразумела, Пілсудзкі мог-бы пагуляць разагнаць сойм, ён мог-бы таксама і бяз зьмены канстытуцыі ў пажаданым для яго духу распаражацца, як яму здумаецца, але ён хоча захаваць некаторы дэкоруи—як для заграніччых банкіраў, так і для абдурваньня працоўных мас у Польшчы.

Палітычны фашызм, бясспрэчна, яшчэ моцны. Ён досыць моцна стварыў блёк капіталістаў, абшарнікаў і кулакоў (што выявілася ў стварэньні памянёнай ужо адзінай фашысцкай партыі, так званага беспартыйнага блёку), ён разлагае ўсе старыя палітычныя партыі. Камбінаваную палітыкаю дробных падачак і суровага тэрору ён здолеў прыцягнуць па свой бок буржуазныя, дробнабуржуазныя, кулацкія элемэнты ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі. Яму ўдалося нават прасякнуць у шэрагі рабочай клясы. Не здавальняючыся паслугамі сацыял-здраднікаў з ППС, прыкрываючых сваю верную службу фашызму апазіцыйным гэстам, ён раскалоў гэту партыю і стварыў уласную фашысцкую рабочую арганізацыю, якая завецца ППС рэвал. фракцыя—але якая звычайна завецца БВС (ад назвы фашысцкай партыі—ВВ).

Але і антыфашысцкі лягер—лягер рэвалюцыйнай барацьбы, на чале якога стаіць кампартыя Польшчы—мацнее і пашырае свой уплыў. Год таму назад на выбарах у сойм ён атрымаў 850 тыс. галасоў, ня гледзячы на скаваньне амаль усіх сьпісаў. З таго часу сілы яго яшчэ больш узрасьлі. У будучы пэрыяд рэвалюцыйных боек гэты лягер уваходзіць у поўнай сьвядомасьці ўсіх вялікіх дзяржасьцяй, якія

ЛІТАРАТУРА—МАСТАЦТВА—КРЫТЫКА.

Е. ПФЛЯУМБАУМ.

Жанчыне.

У песеннай казцы, у былі жыцьцёвай.
Успыхваюць заўжды уладныя словы:
Жанчына і Маці.
Вязьліччам багацьця таноў і сугучаў
услаўлены воблік дзівосна-пявучы
сястры і любімай...
А ў гімнах уздымных ваш поступ знаёмы
з усьмешкай далёкім адпетым прапонам
Работніц сусьвету!..
І сьветлы паэта начутныя оды
складае нарыўнамагутным заводам.
жаночым варштатам...
Сусьветнае сьвята!
натхнёнасьць абліччаў, бязьмерная радасьць
хвалюе і кліча
да песьні адзінай:
„Вітаньне жанчынам!"
А ў гудкасьці даляў і водзыўках дружных
пявучасьць дзяўчыны і братняя мужнасьць—
Адвечная песьня:
Вялікае зьдзейсьнім!—
І ў чоткіх сярыжалях засьведчаны будуць
прайдзёныя далі ў прыгожых паданьнях.
І цьвілыя тваі здабычу стадецьцяў,
як сумную оду даруюць пазце.
А стройныя будні сымфонію сьвята
у сэрцах абудзяць працоўным варштатам!

Чяўжо згінуць ліры, цымбалы і жалейкі?

Многа, многа год таму назад, калі наша Беларусь была данкуючы царскаму ўраду загнана ў падпольле і калі беларуская мова жыла толькі ў шырокіх сялянскіх масах нашай Беларусі, можна было дзе-ні-дзе пачуць этакі старынны інструмант, як ліры, цымбалы і жалейкі. Але тады яны ня былі, як музычны інструмант. Лірай карыстаўся толькі селянін, жабрак, які граў дзе-небудзь пад царквою Часара, ці яшчэ якую небудзь царкоўную песьню, вось як п'іша адзін беларускі нісьменьнік»:

„У дождзьжык і ў пагоду ядно,
Лахмоцьце, што мае, атопкі ўзьдзявае,
Дзьве торбы на плечы кладзе,
Падвяжа вяроўку і там на жаброўку
Жабраи з сваёй лірай ідзе"..

І слухалі гэту ліру тады багамольныя сяляне, слухала цёмная дажджлівая ноч, слухала бярозка і падзівала ёй сваім шэлестам лісьцяў. Цымбалы яшчэ і цяпер можна ўбачыць дзе-небудзь у далёкай вёсцы, асабліва на вясельлі. Жалейкі, гэтыя просьценькія дравяныя дудачкі ўжываліся найбольш у пастушкоў, якія пасучы, жаласьліва гралі пра цяжкую долю беларуса-селяніна. Гэтак было даўней. Народная песьня пасьля рукі кампазытараў захапляе нашага масавага слухача па Беларусі. Нажаль намі амаль зусім ня зьвернена ўвага на выкарыстаньне народных інструментаў у нас у Менску пры музтэхнікуме. Вось толькі нядаўна пры Менскім музтэхнікуме вырас гурток—клясы народных інструментаў. Многа сіл прыпалося пакласьці ініцыятару клясы народных музычных інструментаў тав. Захару, пакуль яму ўдалася а'арганізаваць цымбальны аркестр, гэты аркестр ужо існуе, ужо яго слухала шмат слухачоў г. Менску, ужо нават ёсьць добры і дастатковы рэпэртуар з беларускіх народных песень. Цяжкі толькі ўзрост гэтага аркестру. Ня гледзячы на тое, што цымбальны аркестр існуе другі год, да гэтага часу ён ня мае патрэбнае ўвагі належных установаў.

Каб хто зацікавіўся, ды зайшоў паглядзець, як хаваюцца гэтыя народныя інструманты, дык убачыў бы, што цымбалы і ліры складаюцца, як дровы, на двух шафах, коля печы, ў агульнай жанцэлярыі тэхнікума адзін інструмант на адзін, а жалейкі посяць на кішэнях, бо іх нама дзе аставіць. Ці нармальна гэта? Ад гэтакага хаваньня інструманты рассыхаюцца, псуюцца кожны раз, што вельмі паралізуе працу клясы і адбівае жаданьне ў таварышоў працаваць. Вельмі балюча глядзець на гэтакія адносіны адміністрацыі музычнага тэхнікуму. Кіраўнік гэтае клясы недастаткова яшчэ забясьпечаны матар'яльна (атрымлівае 70 ці 80 руб. у месяц) і павінен шукаць яшчэ працу ў другіх гурткох, ад чаго займаецца з цымбальным аркестрам па 2 гадзіны 3 разы ў тыдзень. Трэба-б было забясьпечыць кіраўніка з матар'яльнага боку і тагды-б ён мог аддаваць усе свае веды і час клясе народных інструментаў. На другім годзе існаваньня клясы народных інструментаў, таварышы, якія граюць у гэтым аркестры, ня маюць нацыянальнай (беларускай, хоць просьцей кажучы, вопраткі, калі прыходзіцца выступаць дзе небудзь, дык адзін прыходзіць у добрым новым гарнітуры, другі ў камсамольскім, трэці яшчэ ў іншым. Няўжо нельга знайсьці крыху сродкаў, каб падтрымаць той запал, тую іскарку, якая зарадзілася і існуе ў выканаўцаў і кіраўніка. Украіна мае свой нацыянальны аркестр бандурыстаў. Авербайджан таксама свой, якія ўжо паказвалі свае дасягненьні ня толькі ў нас у Менску, а па ўсяму СССР, а ў Беларусі і ёсьць цымбальны аркестр і яго няма. Няўжо БАН і Наркамасьветы не зацікавяцца гэтым і дадуць загінуць гэтаму новаму пачынаньню, няўжо яны дапусьцяць, каб гэтыя ліры зноў гралі ў руках сьляпых жабракоў сьвятыя царкоўныя песьні?

Коўшык.

Адказы аўтарам.

АПР—п'ес ня друкуем. Алесю Туроўчыку, Б. Лугоўскаму, Ю. Тулягевічу Л., Зайцу, Ул. Раговіцкаму, П. Мяніьскаму, М. Сьвятловічу, В. Дубку, Сьнежнаму, Міколаю, Л. Якубу Капілеўскаму, А. В., М. Зоркаму, М. С., Я. Кузьмянкову, П. А. Савіцкаму—друкаваць вашых вершаў ня будзем—яны слабо напісаны.

Многім з аўтараў просьць рэдакцыя даць свае заўвагі асобным лістом а то просяць парадзіць: „як трэба састаўляць верш". Яшчэ раз адказваем, што рэдакцыя ця мае ніякае тахнічнае магчымасьці весьці з аўтарамі кансультацыйную перапіску. Паштовая скрынка не заўсёды задаволіць аўтара, вось мы і раздзілі начынаючым аўтарам зьвязацца з літаратурнымі гурткамі, а больш выявіўшым сябе устанавіць сувязь з кансультацыйным бюро беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў, Менск, клюб Карла Маркса.

ДРУГІ БЕЛДЗЯРЖТЭАТР У ГОМЕЛІ.

24 лютага скончыў сваю чатырохмесячную працу ў Гомелі БДТ2. Зачыненьне сэзону адбылося ў прысутнасьці 700 рабочых добрускай паперовай фабрыкі, якія спэцыяльна для прагляду апошняй пастаноўкі БДТ2 «Рэйкі гудуць» прыехалі ў Гомель. Гэты факт ужо сам па сабе сьведчыць, што папулярнасьць тэатру была вельмі вялікай. На адвітаньні з тэатрам шмат рабочых шкадавалі, што тэатр пакідае Гомель.

А чатыры месяцы таму назад іншыя настроі панавалі навакол тэатру. Папершае, у Гомелі было вялікае недавер'е да беларускага тэатру ў агуле і да БДТ2—у прыватнасьці. „Рабочыня пойдзе ў беларускі тэатр, ён не разумее беларускай мовы і ў гэтым выпадку нельга быць максымалістым", а таму... «дасіш расейскую драму» з 60 пром'ерамі ў год. Аднак рабочы пайшоў. З 50 тысяч гледачоў, якія былі на паказах БДТ2, 35 тыс. былі члены саюзаў, 10 тыс. вучні і камсамольцы, 3 тысячы чырвонаармейцы. Тэатр, такім чынам на 90 проц. абслугоўваў працоўнага гледача. На 80 проц. у сярэднім запаўнялася заля тэатру на кожным паказе, ня гледзячы на тое, што абкуставаль байкатаваў тэатр, байкатавалі і некаторыя колы інтэлігэнцыі (дактары, тэхнічная інтэл.) і інш. Ня гледзячы на тое, што некаторыя з «профвожцей» Гомелю вельмі ўпарта адмахваліся ад дапамогі тэатру ў справе прафсаюзнага гледача «Зьнімеце з працы, а я паказу не возьму"!—крычаў абураны старшыня Гомельскага учпрафсожу на прапанову ўзяць паказ для чыгуначнікаў. Рабочы зразумеў тэатр, прыняў яго як свой блізкі. Гэта было адзначана амаль на ўсіх выступленьнях рабочых на I і II канфэрэнцыі рабочых гледачоў.

Тэатр на працягу сваёй працы адзначыў рабочага гледача ад рознай халтуры, якою яго раней кармілі розныя «рускія драмы» і оперэты. На той-жа канфэрэнцыі гледачоў было адзначана, што тэатр побач з дапамогай сваімі апошнімі пастаноўкамі справе сацыялістычнага будаўніцтва, побач з дапамогай правядзеньню беларусізацыі, значна ўзьняў культурны ўзровень рабочых, прывучыўшы іх да высока-мастацкай прадукцыі сапсаваўшы густ на ўсялякую халтуру накшталт „Пяці начей".

За час сваёй працы ў Гомелі (з 20 кастр. па 24 лютага) тэатр даў 75 паказаў, з іх некалькі дармовых і 1 у рабочым клюбе.

6-я карціна з п'есы «На прадвесьні»

Са скончэньнем працы БДТ2 у Гомелі можна ўжо падвесьці агульныя вынікі яго працы за апошні год.

Папершае: пачынаючы з пастаноўкі „Каля тэрасы" цераз «Разлом», «На прадвесьні» і «Рэйкі гудуць» тэатр выйшаў на правільны ідэолёгічны шлях. Адсюль і тое падтрыманьне пралетарскай грамадзкасьці, якое меў тэатр за апошні час. Надалей патрэбна дераз належнае кіраўніцтва НКА дамагацца, каб тэатр не зьвярнуў ізноў у эстэцкае балота.

Другое. Тэатр, хоць і быў адарваны ад сталічнага культурнага жыцьця, аднак, ня зьнізіўся да правіцыялізму, супроць якога папераджае і разалюцыя ЦК КП(б)Б на апошняй тэа-дыскусіі. Наадварот, апошнімі 2-мя пастаноўкамі («На прадвесьні» і «Рэйкі гудуць») тэатр паказаў, што ён можа, захаваўшы высокую тэа-культуру, быць зразумелым і блізкім працоўнаму гледачу. Выпускаючы прадукцыю даволі высокай мастацкай якасьці з пэўным пралетарскім зьместам, тэатр адмовіўся ад пустой так званай «высокамастацкай» формы, якая па сутнасьці зьяўлялася альбо сродкам схавацца ад сучаснасьці, альбо яшчэ горш „очковтирательством" пралетарскай грамадзкасьці.

Напруджанасьць у працы за апошні пэрыяд у значным стопні зьнішчыла тыя „мастацкія" хуліганскія ўчынкі, якія мелі месца ў тэатры раней. Вырасла адказнасьць за працу і вытворчая дысцыпліна.

Пры належным кіраўніцтве (ідэолёгічным і мастацкім) НКА, пры ачышчэньні тэатральнага калектыву ад нягодных па сутнасьці антысавецкіх, хуліганскіх, бяздарных акторaў (а іх адзінкі), можна спадзявацца, што БДТ2 займе тое месца сярод тэатраў БССР, якое яму належыць і спраўдзіць тыя надзеі, якія на яго ўскладаліся пры адчыненьні.

А. Некрашэвіч.

Тэатр і музыку ў батрацкія гушчы

На днях у Менск зьявярнулася з свайго падарожжа вандроўная трупа ЦК саюзу сельгаслесрабочых «Полымя». Трупа за 13 месяцаў абвандравала Бабруйскую, Віцебскую і Мазырскую округі, заглянуўшы ў самыя глухія куткі нашай Беларусі і ўносячы пламень Беларускай культуры ў жыцьцё нашага батрацтва.

Трупа складаецца з 12 чалавек, з якіх большая частка пядаўнешнія батракі, рабочыя савгасаў і іншыя працоўныя без спэцыяльнай навукі і толькі 2 чалавекі выхадцы з трупы Галубка. І тым больш ведаючы склад і сілу тэатру прыходзіцца давацца дзіву і радавацца за такі вялікі яго посьпех.

Пры пастаноўцы «Наймітка», іграўшыя ў ролях: батрака (дзед), батрака „Апанаса" і батрачка „Хрысьціна", артыстыя, як відаць, перажываюць сваё мінулае становішча, чым і даюць мастацкую жыцьцёвую карціну без ніякіх прыкрас і нацягненасьці.

П'есы большай часткай падабраны з жыцьця батрацтва, якрака адбіваючы жыцьцё і быт батрацтва ў дарэвалюцыйны час і тую муку, якую яны пераносілі і звычайна, не бачачы і не знаходзячы нідзе забароны, канчалі самагубствам, як напрыклад: „Наймітка", „Чортава Кузьма" і г. д. Праўда зьмест п'есы патрабуе некаторага абнаўленьня, неабходнай апрацоўкі ў духу рэвалюцыйнага настрою і больш яскравага сацыяльнага ўкладу жыцьця батрацтва.

Вандроўная трупа мае добрую музычную частку абсталяваную нацыянальнымі музычнымі інструментамі: цымбаламі, скрыпкай, гармонікам і падборам добрых музыкантаў. Канцэртнае аддзяленьне спэктаклю звычайна са скокамі ляворыкі [illegible] вялікага гледача.

Апроч пастановак працаўнікі вандроўнага тэатру правозяць і іншую культработу, абслугоўваюць батрацтва бібліятэкай-перасоўкай, якую возяць з сабой і інструктуюць пізавыя прафячэйкі па культпрацы і асабліва дапамагаюць драмгурткам.

Наогул вандроўная трупа палкам сябе апраўдала і адзначае культурным занатрабаваньням нашага батрацтва і рабочых савгасаў.

ЦП саюзу сельгаслесрабочых трэба зьвярнуць больш увагі, лепш матар'яльна забясьпечыўшы ўдзельнікаў трупы і наогул даць магчымасьць вандроўнаму тэатру расьці і мужыцца.

П. Т.

Пра БДВТ.

(Ліст з вёскі.)

У пачатку лютага г. г. Вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам Галубка наведаў наш глухі куток Гомельшчыны—Суткоўшчыну, Лоеўскага раёну. У клюб школы сялянскае моладзі з суседніх вёсак прыехала многа сялян. На 200-300 месц разьмясьцілася чалавек 400, а часткі дзьве засталіся на вуліцы.

Тэатрам цікавяцца, тэатр любяць.

3-га лютага адбыўся канцэрт, а 4-га была паказана п'еса Ул. Галубка—„Ганка".

Выкананьне бясспрэчна добрае, толькі тэатру трэба мець на ўвазе пашырэньне свайго рэпэртуару. Бо сёньня мы бачым тое, што паказвалася два гады таму назад.

Аркестр выступае са старым рэпэртуарам. Хор таксама ня мае асаблівых навінак, «Лявоніхі» і «бульбы» малавата.

А наогул вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам Галубка праводзіць надзвычайна вялікую культурную работу. На Гомельшчыне ён мае асабліва карыснае значэньне ў справе беларусізацыі. Трэба, каб сюды ён часьцей прыяжджаў.

Дзядзька з-пад Суткава.

Я. ІВАШЫН.

Госьці з гораду.

Разьлілося сонца золатам чырвоным
Па кілімах сьнежных, па кустох балот.
Веснавую казку сьніць лагі-загоны...
Пехта шпарка едзе з гораду ў сяло.

Песьню маладую рассыпаюць бомы,
Навяваюць мары казачных падзей.
А ў прасторах-далях, што цабеглі в бору,
Ружай беласьнежнай палымнее дзень.

На абліччах сьвежых ружавее радасьць,
І расьце ўрачыстасьць сьнегавых палёў.
Хутка ўжо пад'едуць: вёска госьцям рада,
І мароз калючы за плятнём прылёг.

На пагорку вёска... Сьмех і гоман гулкі
Ля вясковай школы павадкай расьце.
Скрып саней музычны лашчыць сэрца й вулку.
Вёска злоў вітае дарагіх гасьцей.

Сёньня дзень жанчыны—ў школе урачыста.
І пульсуе ў вёсцы новае жыцьцё.
Бабы і дзяўчаты папрышлі ўсё чыста,
Каб паслухаць слоўка гарадзкіх сясьцёр.

Стол заслан абрусам, а на сцэне Ленін.
Дарагія госьці селі за сталом...
І гучаць прамовы веснавым струменем,
На жаночых тварах рдзеецца сьвятло.

Сьпее ў сэрцы пэўнасьць, і мацнеюць сьцежкі,
Што вядуць у горад за крутой гарой.
І ліюцца песьні, і цьвітуць усьмешкі
На бадзёрых тварах шчырых змагароў...

БІБЛІАГРАФІЯ.

КУЗЬМА ЧОРНЫ. Зямля. Раман. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск—1928 г. Тыраж 3.000 экз. 354 стар. Цана 1 р. 95 к.

У апошні час літаратурнае жыцьцё Беларусі, галоўным чынам, характарызуецца выхадам у сьвет даволі значнай колькасьці буйных твораў—раманаў, аповесьцяй, паэм. Гэтыя буйныя творы фактычна зьяўляюцца толькі першымі ластаўкамі ў беларускай літаратуры і зусім зразумела, калі некаторыя з іх уяўляюць сабой толькі вынік тых ці іншых шуканьняў у галіне новага і яшчэ зусім маладога ў беларускай літаратуры жанру. З гэтага пункту гледжаньня мы і будзем падыходзіць да разгляду новага і фактычна першага раману Кузьмы Чорнага, бо друкаваная ў мінулых гадох у часопісі «Узвышша» яго „Сястра" хоць і называецца раманам, але ў сапраўднасьці ёсьць ня што іншае, як калекцыя эскізных зарысовак часамі вельмі мастацкіх, але награмаджаных бяз ніякага складу і ладу.

Як відаць з назвы „Зямля" і з першых разьдзелаў раману, аўтар меў на мэце адлюстраваць на магчымасьці поўна жыцьцё і побыт людзей зямлі—сялян і бадай што яшчэ аграрнае пытаньне ў сучаснай вёсцы.

Сьляды гэтага мы і сустракаем у рамане.

Аўтар «Зямлі» недае тыпа сучаснага селяніна абмяжоўваецца тым, што праводзіць перад намі ў калейдаскопе вясковага жыцьця шэраг характараў, часам зусім ня тыповых (напр. настаўнік, Тамаш, Мікалай).

Найбольш яскравымі трэба лічыць характары наступных асоб: Белабародага Паўла, заможнага селяніна з моцна разьвітым гаспадарчым інстынктам, спралетарызаванага ў выніку вайны бежанца Мікалая, бедняка Мацьвея і яго заможнага брата Сабасьцяна, Юліка Баранавіча хлопцаў Алеся і Клемуся ды інш.

Характэрнаю рысай Паўла зьяўляецца яго моцна разьвіты гаспадарчы інстынкт. Вартасьць чалавека для Паўла вызначаецца добрай і багатай гаспадаркай, а тых, у каго яна бедная, як напрыклад у Мацьвея, ён амаль што зусім ня лічыць за людзей.

Бежанец Мікалай зьяўляецца ў гатых адносінах поўнаю процілеглаcьцю Паўла. Ён страціў у завірусе вайны сваю зямлю і хату і ў яго не засталося ўжо ніякіх сьляды гаспадарчага інстынкту. Ён адмаўляецца ад зямлі і ня хоча мець сям'і і гаспадаркі. Ён любіць зямлю і разумее яе ў тым, каб жыць, нічога ня мець і вандраваць на сьвеце.

Глыбокае ўражаньне пакідае асоба бедняка Мацьвея, з глыбокай крыўдай на свой благі лёс.

Горш абстаіць справа з абрысоўкай прадстаўнікоў вясковай інтэлігэнцыі. Большменш удаўся аўтару толькі адзін дзяк, Каморнік выяўлен зусім слаба.

Настаўнік паказваецца на адзін толькі момант і хутка зьнікае, але тым ня меней пасьпявае пакінуць непрыемнае ўражаньне сваёй карыкатурнасьцю.

Сапраўды, што тыповага знайшоў аўтар у такім настаўніку, які больш за ўсё клапоціцца аб сваёй «гарбузовай палітыцы» (разводзіць гарбузы, каб купіць паліто) і пакідае камсамольскі сход, каб залажыць разгародку ў агоце, каб гусі капусты не папсавалі. Калі і даводзілася аўтару сустракаць дзе небудзь падобнага настаўніка, то можна было напісаць пра яго ў фэльетоне, або ў апавяданьні.

Далей, што датычыцца аграрнага пытаньня, можна сказаць толькі адно, што той яшчэ аграрнае пытаньне ў сучаснай вёсцы.

Сьляды гэтага мы і сустракаем у рамане.

Аўтар «Зямлі» недае тыпа сучаснага селяніна абмяжоўваецца тым, што праводзіць перад намі ў калейдаскопе вясковага жыцьця шэраг характараў, часам зусім ня тыповых (напр. настаўнік, Тамаш, Мікалай).

Найбольш яскравымі трэба лічыць характары наступных асоб: Белабародага Паўла, заможнага селяніна з моцна разьвітым гаспадарчым інстынктам, спралетарызаванага ў выніку вайны бежанца Мікалая, бедняка Мацьвея і яго заможнага брата Сабасьцяна, Юліка Баранавіча хлопцаў Алеся і Клемуся ды інш.

Характэрнаю рысай Паўла зьяўляецца яго моцна разьвіты гаспадарчы інстынкт. Вартасьць чалавека для Паўла вызначаецца добрай і багатай гаспадаркай, а тых, у каго яна бедная, як напрыклад у Мацьвея, ён амаль што зусім ня лічыць за людзей.

Бежанец Мікалай зьяўляецца ў гатых адносінах поўнаю процілеглаcьцю Паўла. Ён страціў у завірусе вайны сваю зямлю і хату і ў яго не засталося ўжо ніякіх сьляды гаспадарчага інстынкту. Ён адмаўляецца ад зямлі і ня хоча мець сям'і і гаспадаркі. Ён любіць зямлю і разумее яе ў тым, каб жыць, нічога ня мець і вандраваць на сьвеце.

Глыбокае ўражаньне пакідае асоба бедняка Мацьвея, з глыбокай крыўдай на свой благі лёс.

Горш абстаіць справа з абрысоўкай прадстаўнікоў вясковай інтэлігэнцыі. Большменш удаўся аўтару толькі адзін дзяк. Каморнік выяўлен зусім слаба.

Настаўнік паказваецца на адзін толькі момант і хутка зьнікае, але тым ня меней пасьпявае пакінуць непрыемнае ўражаньне сваёй карыкатурнасьцю.

Сапраўды, што тыповага знайшоў аўтар у такім настаўніку, які больш за ўсё клапоціцца аб сваёй «гарбузовай палітыцы» (разводзіць гарбузы, каб купіць паліто) і пакідае камсамольскі сход, каб залажыць разгародку ў агоце, каб гусі капусты не папсавалі. Калі і даводзілася аўтару сустракаць дзе небудзь падобнага настаўніка, то можна было напісаць пра яго ў фэльетоне, або ў апавяданьні.

Далей, што датычыцца аграрнага пытаньня, можна сказаць толькі адно, што той

чытач, які на падставе назвы „Зямля" і першых глаў кніжкі, будзе спадзявацца ўбачыць у ёй адлюстраваньне гэтага галоўнага і самага інтэнсыўнага ў жыцьці сучаснай вёскі пытаньня, няпрыемна расчаруецца, прачытаўшы гэтую самую «Зямлю».

Няма, здаецца, ніводнага самага глухога кутка беларускай вёскі, дзе ў сучасны момант пытаньні мэліарацыі, абрэзкі кулацкіх гаспадарак, рассяленьня і калектывізацыі не зьяўляліся-б стрыжнем грамадзкага жыцьця. Аднак, Кузьма Чорны, даючы гэтак званнае шырокае палатно з вясковага жыцьця амаль што зусім не зьвярнуў увагі на гэтую яскравую і вельмі важную зьяву. У „Зямлі" мы сустракаем толькі гутаркі аб нейкім перамеры севажаці, але самы гэты перамер нідзе не паказан, ён адбываецца, як быццам, недзе за кулісамі. У канцы кніжкі камуністы Алесь вельмі часта гаворыць аб тым, што праз некалькі год ён зьбіраецца арабіць новы перамер зямлі і ўтварыць камуну, але чытача гэтая гаворка пераконвае слаба, ды і паўтараецца яна да таго часта, што можа толькі надакучыць.

Некалькі год таму назад крытык Адам Бабарэка, разглядаючы зборнік аднаго з маладых паэтаў, зазначыў, што ўсялякія дэкларацыйныя заявы ў літаратуры ня маюць ніякага значэньня ў эпоху творчага будаўніцтва. Ён зусім слушна зазначыў, што мала сказаць якую-небудзь гучную фразу, накшталт „Сьвету новаму дзьверы адчынім", бо чытач хоча бачыць, як спраўды гэтыя дзьверы адчыняюць. *)

Як мне здаецца, галоўнай задачай аўтара ў гэтым творы было тое, што завуць на мове сучаснае літаратурнае тэрміналёгіі, паказваньнем жывога чалавека.

Аўтару ўдалося даць сёе-тое ў гэтым напрамку. Удалося аўтару таксама даць і шэраг мастацкіх бытавых малюнкаў: сход, хрысьціны вясельная бяседа, музыкі і г. д. Надзвычайна мастацкі малюнак—сьмерць Мацьвеіх.

Момантам адмоўнага характару зьяўляецца ў «Зямлі» і надзвычайная бяздзейнасьць і інэртнасьць гэроэў. Яны гаворыць „непаранальна больш, чымся дзейнічаюць. Даволі добрую характарыстыку дае ў адным месцы сам аўтар.

— «Цьфу, каб ты згарэў гэтакі чалавек». От гаворыць ён, гаворыць, будзе цэлы дзень гаварыць, а нічога ня скажа. Што ты мне тут вубы загаварываеш, ты мне гавары выразна». (стар. 157). Гаварыць гэтак умее ня толькі Вашыновіч, але і сам аўтар і чытач часамі мае поўнае права занатрабаваць ад яго:

— „Гавары выразна".

Наўрад ці можна «Зямлю» назваць шырокім палатном у поўным сэнсе гэтага слова. Хутчэй яна нагадвае бясконца доўгую вамітку, на якой у фатаграфічнай перадачы аўтар разгортвае парад чытачом прадзы сялянскага жыцьця і гутаркі сваіх гэроэў. Мова, як і заўсёды ў Кузьмы Чорнага, прыгожая, кампазыцыя досыць прымітыўная.

Выратоўвае яе больш за ўсё вялікае замілаваньне аўтара да сялянскага жыцьця.

Арк. Лясны.

*) Гл. «Маладняк» № 2 (11) 1926 г. Рэцэнзія А. Бабарэкі на зборнік А. Акімовіча «Вершы».

В. СТАШЭЎСКІ.

ПАСЬЛІЗНУЛІСЯ.

— Гэтыя грымоты наробяць недзе клапотаў.

Так кажуць часта, калі насунецца хмара, пачнецца гром і маланка.

Звычайна ў такія траскучыя хвіліны запальваецца граніччная сьвечка, якая гарыць да тае пары, пакуль ня пройдзе небясьпека.

Пройдуць хмары, суцішыцца гром, і старэнькая бабулька з нейкай асаблівай прыемна-набожнай мінай тушыць сьвечку.

— Што, памагла?—пытае ўнук яе, Паўлюк.

— Вось маўчы!—адказала яна, глянуўшы на ўнука,—памагла ці не памагла, гэта ўжо яму ведаць.

Паўлюку хочацца запытаць бабульку пра гэтага самага «яго». Словы гатовы самі скінуцца з языка, але ён затрымоўвае іх, проста глынае, бо шкада парушаць яе строга-ласкавы выгляд і пасьлягромавы спакой.

Паўлюк нярав усьміхаўся, гледзячы, як сяляне бароняць сябе ад грому, як яны задобрываюць некага, хто пасылае яго.

Чытае Паўлюк газэты. Паткнуўся на грамаадводы. Пішуць, што маланка—гэта плёвае дзела, што яе вельмі лёгка ў землю загнаць, дзе ўжо яна ня мае ніякай моцы. Раць сабраць крыху грошай ды агулам, вобчаствам купіць такую штучку ў каапэратыве.

Паўлюк—чалавек небагаты, але ўсюды, дзе толькі датыкалася справа якіх-небудзь узносаў, ён заўсёды быў першым. Ён вельмі любіў увесьці што-небудзь новае ў сваёй вёсцы.

Ён, напрыклад, даказаў, што авечы сыр ён больш любіць, чым каровін, што калі ён быў у часе вайны ў Бэсарабіі, дык амаль што сам і рабіў іх. Кажуць, што прабаваў даіць сваіх авечак, але сыру чамусьці не зрабіў, не хапіла, кажуць, нейкага парашку.

Дзе толькі гэтая вайна не вадзіла Паўлюка, завяла і ў латышы. Здольны народ. Асабліва піва добрае могуць рабіць. Там кожны сам сабе піваварь. Паўлюк ня толькі піў гэтае піва, а нават самастойна варыў у адным латышкі-салдаткі.

Толькі гэта скончылі вайну з немцамі, уся вёска Аўсюкі ўзялася за самагонку.

Такі разьвялі пах у лесе, што ніводная, кажуць, птушка по магла ўсядзець там.

Паўлюк сталў у баку. Ня то, каб ён вусім—у баку, не, ён быў пасярод усіх, ён хадзіў па ўсіх гэтых «вінакурнях», знаёміўся з сыстэмаю апаратаў, рабіў заўвагі, але сам ня гнаў. Ён густаваў лепш піва, асабліва латыскае.

— Гэта што, клопату многа і смуроду ня менш, а смаку—ні на зерне маку,—зазначаў Паўлюк, аглядаючы вінакурню.

— У латышох ня так. Там народ спрытнейшы, спрактыкаваны. Там ён на будзе табе гэтак пэцкацца. Там ён дома робіць затор і бяз жадных апаратаў праз 2-3 дні такое выходзіць піва... І ня проста піва, а піва-мёд.

— Хе, выпіў, аблізаўся, ды пудзіка ячменю як і ня было,—абазваўся «вінакур».

— Ну, ня думайце, што так сабе,—казаў далей Паўлюк,—часам стукне ў галаву, што і неба захістаецца.

— Я памятаю раз...

— Што нам неба...—перабіў яго „вінакур",—вось, каб зямля ходарам пашла, тады я ведаю, што выпіў, а ад піва твайго латыскага не зварухнецца нават гэты пень. Праўда, мужчыны?

— Праўда!—адказалі два яго паможнікі.

Маючы падтрыманьне свайго погляду, „вінакур" дабіваў свайго праціўніка.

— Спрактыкаваны, кажа, народ, зерне псуе на піва...

— На мёдзік,—дабавіў першы памочнік.

— На дубік,—дабавіў, сьмяючыся, другі памочнік. Паўлюк стаў моўчкі, а вырас твару яго быў такі, быццам ён кажа ім:

— Эх, вы, казьлінная парода, рана сьмяецеся.

— Што, заткнуўся?—пытае «вінакур» і падносіць яму з паўконаўкі яшчэ цёпленькае.

— На, прамачы, ды на піва свае пазаві.

— Вось я і пазаву,—прымаючы конаўку, пачаў Паўлюк.

— Я зраблю, я вам дакажу, што піва гэта не самагонка. Я ўжо прарошчваю...

— Ха-ха-ха!—разьлягалася па лесе.

— Вы чулі, мужчыны, што ён хоча даказаць нам?—пытаў «вінакур» і сам адказваў:

— Піва гэта—не самагонка. Што ты, браце, з нас дурняў строіш. Хіба-ж мы гэтага ня ведаем?

— Я думаю, што нельга ведаць смак таго, чаго не прабаваў чалавек. А вось я зраблю і тады паглядзім, што вы скажаце.

— Ну, вось ты і зрабі.

— І зраблю.

— І паспытаем.

— І паспытаем.

— І ерунда будзе,—падкалоў «вінакур».

— Паглядзім,—адказаў Паўлюк.

На гэты раз Паўлюк ня ўсім «вінакурням» аддаў свой візыт. Ён быў крыху расстроены.

— Не, я ім дакажу, я пераварну іх на піва!—голасна, размахваючы рукамі, казаў ён сам сабе, ідучы да дому. Народу трэба паказаць. На слова ня хоча верыць.

Уся вёска ведае, што Паўлюк рыхтуе піва-мёд. Паўлючыха запрасіла ўжо сваю куму, а гэта кума запрасіла сваю куму, а тая кума ды сваю кучу. Адным словам, па жаночай лініі неўся быць баль.

Вось ужо в сянец пачало пахнуць падсмаленым ячменем. Самагонныя спецы пачалі круціць пасамі:

— Мусіць,—кажуць,—нешта добрае павінна выйсьці.

А Паўлюк толькі пасьмейваецца.

— Народу,—кажа ён сам,—трэба паказаць, трэба навучыць, тады ён зразумее і зробіць.

Аднак набліжаўся дзень пробы. Вечарам зьявіцца «экспэртыза». Будзе проба, як кажуць вінаробы, дегустацыя.

Паўлюк неспакойны. Блізка паўдня, а ў піве а ні таго смаку, а ні тае моцы. Ну, не раўнуючы, як тое пойза цялячае. Як-жа будзеш паказваць такое?

А народ ідзе.

Паўлюк увесь вечар стаіць у варотах і папярэджвае, што піва яшчэ не астоілася, што праз два дні можна будзе пакаштаваць.

Ідуць два дні. Асела крыху на дно цэбра каламута, а смаку і моцы няма.

Бачыць Паўлюк, што непераліўкі, скочыў да аднаго хлапца, дастаў пару бутэлек самагонкі і боўтнуў іх у гэты цэбар.

— Заходзьце, прабуйце,—запрашае ён чатырох мужчын, якія «заўчасьне» падышлі да яго хаты. Зашлі. Папрабавалі. Плюнулі. Пашлі.

Плюнуў і Паўлюк: пойла.

Аблізаліся кумкі.

І пачалі-ж паласкаць язычкамі. І пашла пагаворка і на ваколічныя вёскі: «Наробіш, як Паўлюк піва».

Ну, проста чалавеку хоць не паказвайся нікуды,

— Зноў парашку якога не хапіла?—падсьмейваўся галоўны «вінакур» вёскі.

— Ну, ці вачыў ты хоць раз, як у гэтых латышох робяць тое піва?—пыталася жонка Паўлюка.

— Каб-жа бачыў,—адказваў Паўлюк,—зады-б яно можа і вышла-б што.

— Дык чаму-ж ты робіш тое, чаго ня ведаеш?—зноў пытае жонка.

— Але-ж я чуў, як яно робіцца, і магло-б выйсьці добрае, але ў іх, відаць, ячмень не такі і гэта так яно і будзе,—даказваў Паўлюк, жадаючы апраўдаць сябе.

Цяжкі быў час для Паўлюка. Прыходзілася маўчаць. А часам хацелася параіцца з кім-небудзь навінамі аб чым, як-бы, скажам, самому цялячую шкурку вырабіць на хром.

Многа добрых думак лезла ў галаву Паўлюка, што-небудзь можна было-б і зрабіць, але каму ні скажы, дык зараз і пачне пра піва ляпаць.

А сенажаці ўжо каторы год ня родзяць. Стогне вёска, як прыдзе вясна. Няма чым сканіну карміць. Некаторыя пачалі кідаць «комплементы» па адрасу савецкае ўлады, але ніхто не рабіў ніякіх захадаў, каб выйці з гэтае бяскорміцы. Была ў аднаго фальбаркоўца канюшына, ужо, здаецца, кожнаму відаць, што добрая рэч, дык чамусь-ці рашылі, што толькі на фальбарку можна балаванца гэтымі прысмакамі.

Здарылася Паўлюку паехаць з каапэрацыйнымі парсюкамі на станцыю, з сапраўднымі парсюкамі, і там падхапіць па дарозе назад пасажырчыка. На віду і з разгавору чалавек вучаны. Паўлюк і пачаў выкладаць яму ўсё жыцьцё свае вёскі. Напрыкметна праехалі яны дваццаць адну вярсту, дзе пасажырчык павінен быў наймаць другую хурманку, каб праехаць яшчэ шэсьць вёрст у бок ад шляху, да сваіх бацькоў. Нікому з іх не хацелася абрываць гэту квяцістую істужку размовы.

— Завяву вас да вашага дому,—сказаў Паўлюк, і цьвёрда павярнуў каня ў левы бок па простую вузеньку дарожку.

Прыехалі.

— Дык вось,—кажа пасажыр,—калі ў вас так дрэнна з сенам, я дам вам насеньне аднае травы, сэрадэлькаю яна завецца. Пасейце і будзеце мець добрае сена. Пасейце і канюшыну.

Насыпаў бацька гэтага пасажыра ў мяшок Паўлюку гэтага насеньня і ён паехаў.

На гэты раз Паўлюк нікому ні слова не сказаў.

Вясною пасеяў ён гэту траву ў папары і чакае, што ўжо будзе.

Праз некаторы час пытаюць у Паўлюка суседзі:

— Што гэта за злыбеда выскачыла на тваім шнуры?

Паўлюк адказаў, што ня ведае. Калі-ж трава гэта пачала падымацца вышэй, Паўлюку ўжо не давалі спакою:

— Кажы, што ты тут разьвёў? Можа заразу якую, каб папсаваць нам пале

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ І САВЕТУ НАР. КАМІСАРАЎ БССР

ПРА АПЛАТУ ЖЫЛЫХ ПАМЯШКАНЬНЯЎ У ГАРАДОХ БССР.

На падставе пастаноў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў СССР за 4 чэрвеня 1926 г. „Аб кватэрнай плаце і мерах для ўпарадкавання карыстання кватэрамі ў гарадзкіх паселішчах» (З. З. СССР 1926г. № 44, арт. 312) і за 4 студзеня 1928 г. «Аб жыльёвай палітыцы» (З. З. СССР 1928 г., № 6, арт, 49) і замест свае пастановы «Аб аплаце жылых памяшканьняў у гарадох БССР» за 23 кастрычніка 1926 г. (З. З. БССР 1926 г., № 44, арт. 165), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць даручыць гарадзкім саветам выдаць абавязковыя пастановы пра стаўкі кватэрнай платы на падставе наступных артыкулаў:

1. Асноўная кватэрная плата ўстанаўляецца для гарадоў Менску, Гомелю і Віцебску ў 37 кап. за 1 кв. мэтр і для астатніх гарадоў—у 35 к. на месяц за 1 кв. мэтр жылое плошчы.

Плата за асьвятленьне і ваду бярэцца незалежна ад кватэрнае платы паводле спэцыяльных тарыфаў.

2. Рабочыя і служачыя, якія зарабляюць ад 101 да 125 руб. у месяц, плацяць асноўную кватэрную плату паводле арт. 1 гэтае пастановы.

Для рабочых і служачых з заработкам 100 р. і менш на месяц з асноўнае кватэрнае платы робіцца паўны процант скідкі, а пры заработку больш за 125 руб. на месяц да асноўнае кватэрнае платы даюцца паўны процант надбаўкі.

3 вызначанае для кожнага паасобнага наймальніка кватэрнае платы робіцца скідка ў залежнасьці ад выгаднасьці кватэры. Пры гэтым кватэрная плата ня можа быць менш за 5,5 кап. за кв. мэтр.

3. Для рабочых і служачых, якія зарабляюць 100 руб. і менш на месяц устанаўляецца наступная скідкі з асноўнае кватэрнае платы:

для тых, хто заробляе на месяц	100—91 руб.	—	5 проц.
„ „ „ „ „	90—81 „	—	15 „
„ „ „ „ „	80—71 „	—	24 „
„ „ „ „ „	70—61 „	—	33 „
„ „ „ „ „	60—51 „	—	43 „
„ „ „ „ „	50—41 „	—	52 „
„ „ „ „ „	40—31 „	—	62 „
„ „ „ „ „	30—21 „	—	70 „

4. Рабочыя і служачыя, якія зарабляюць ня больш за 20 р. на месяц, і асобы, што атрымліваюць пэнсію ад органаў сацыяльнага забясьпечаньня, альбо сацыяльнага страхаваньня, калі яны атрымоўваюць пэнсію ня больш за 20 р. на месяц, беспрацоўныя, зарэгістраваныя на біржы працы, а дзе бірж няма—у прафесыйных саюзах, вучні, што ня плацяць за навучаньне, сем'і чырвонаармейцаў, што знаходзяцца на іх утрыманьні да ўзяцьця гэтых чырвонаармейцаў на васінную службу і ня маюць самастойных сродкаў на жыцьцё, аплачваюць памяшканьні па 5,5 кап. за кв. мэтр на месяц назалежна ад выгаднасьці кватэр.

Асобы, што атрымоўваюць пэнсію ад органаў сацыяльнага забясьпечаньня альбо сацыяльнага страхаваньня больш за 20 р. на месяц, прыраўніваюцца да адпаведнае катэгорыі рабочых і служачых.

5. Для рабочых і служачых, што зарабляюць больш за 125 р. на месяц, устанаўляюцца да асноўнае кватэрнае платы наступныя надбаўкі:

а) для асоб, якія зарабляюць на месяц ад 126 да 200 р. набаўляецца па 0,33 к. на 1 кв. мэтр з кожнага рубля заработнае платы, пачынаючы з 126 р.;

б) для асоб, якія зарабляюць на месяц ад 201 да 240 р. апроч паказанага ў п. «а» набаўляецца па 0,45 кап. з кожнага рубля, пачынаючы з 201-шага руб.;

в) для асоб, якія зарабляюць на месяц больш за 240 р., апроч паказанага ў п. «а» і «б», набаўляецца 0,23 к. з кожнага рубля, пачынаючы ад 241-шага р. з тэй, аднак, умовай, каб стаўкі кватэрнае платы для асоб з заработнай платай больш за 275 р. на месяц не перавышалі 94 к. за 1 кв. мэтр для г. Менску, Гомелю і Віцебску і 85 кап. для іншых гарадоў БССР.

6. Пры вылічэньні кватэрнае платы з рабочых і служачых падлічваецца ўвесь іх заработак, апроч звышмернага прыработку, нагрузкі асоб, што аплачваюцца па тарыфу адказных палітычных работнікаў і літаратурнага заработку рабочых і служачых, што працуюць па найму поўны рабочы дзень. Асобы, якія атрымоўваюць сацыяльную стаўку, і тыя, што працуюць па сумяшчальнасьці і атрымоўваюць у дадатак да сваёй асноўнай месячнай стаўкі сацыяльную плату для заахвочваньня ў рабоце, паводле асобнага закону (З. З. Саюзу за 1927 г., № 16, арт. 167), альбо плату процантамі, аплачваюць кватэру з усяго месячнага заработку.

7. Кватэрная плата з педагагічнага персаналу школ усіх тыпаў вылічваецца толькі з заработку за спэцыяльна ўстаноўленую для іх пастановаю СНК БССР за 9 ліпеня 1925 г. «Аб мінімальных нормах нагрузкі педагогаў у культурна-асьветных установах, падпарадкаваных Народнаму Камісару Асьветы» (З. З. БССР 1925 г., № 37, арт. 332) мінімальную норму рабочага часу.

Навуковым працаўнікі навуковых устаноў і вышэйшых школ, якія атрымоўваюць заработак паводле штатных акладаў плацяць за кватэру ў такім самым разьмеры, як і навуковым працаўнікі адпаведных катэгорый, заработак якім выплачваецца за пагадзінную працу.

Калі месячны заработак навуковых працаўнікоў перавышае 200 руб., яны плацяць за кватэру паводле арт. 5 гэтае пастановы.

8. Вайскоўцы сярэдняга, старшага і вышэйшага кадравага начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміи, а таксама вайскоўцы радавога і малодшага начальніцкага складу па-затэрміновай службы плацяць за кватэры на аднолькавых падставах з рабочымі і служачымі, прычым гэтая плата вылічваецца для паказаных вайскоўцаў з асноўнага акладу заработнае платы.

Асобы начальніцкага складу арміі за час, у які яны знаходзяцца ў лягерах, на дапрызыўнай падрыхтоўцы, альбо на курсах, калі яны на новым месцы не карыстаюцца бясплатнаю кватэраю, плацяць за занятыя імі кватэры 50 проц. кватэрнае платы.

9. Кватэрная плата з груп рабочых і служачых, якія паводле сваёй заработнай платы павінны плаціць менш асноўнае кватэрнае платы (арт. 1), вылічваецца з агульнага заработку ўсіх членаў сям'і, але ня больш асноўнае кватэрнае платы з тэй умовай, каб кватэрная плата складала ня больш 10 проц. агульнага заработку сям'і.

З іншых катэгорый платнікаў кватэрная плата бярэцца з заработку альбо даходу члена сям'і з найвышэйшым у сям'і заработкам альбо даходам.

10. Для асоб вольных прафэсій, якія сыстэматычна займаюцца прыватнаю практыкаю, стаўкі кватэрнае платы ўстанаўляюцца:

а) для асоб, якія ня плацяць дзяржаўнага падаходнага падатку ў разьмеры асноўнай кватэрнай платы (арт. 1);

б) для асоб, якія плацяць дзяржаўны падаходны падатак—ня менш асноўнай кватэрнай платы і павялічваецца ў залежнасьці ад даходу платніка, але ня больш як да 1 р. 32 к. за 1 кв. мэтр на месяц.

11. Для літаратараў, мастакоў і скульптураў, якія зарабляюць на месяц ня больш за 200 руб., кватэрная плата ўстанаўляецца на тых самых падставах, як і для рабочых і служачых.

Дадатковая жылая плошча, якая займаецца мастакамі і скульптурамі пад спэцыяльныя рабочыя майстэрні, аплачваецца ў звычайным разьмеры паводле нармальных ставак для гэтых катэгорый платнікаў.

12. Саматужніці—члены вытворчых арцелей, якія працуюць толькі ў сувольных майстэрнях, што ўваходзяць у сыстэму прамысловай кааперацыі, аплачваюць жылыя памяшканьні па падставах, устаноўленых для рабочых і служачых.

13. Для саматужнікаў і рамесьнікаў, якія ня маюць наймовых рабочых, а таксама якія маюць аднаго рабочага альбо 2-х вучняў і не плацяць падаходнага падатку, плацяць нармальную кватэрную плату паводле арт. 1-га.

14. Для саматужнікаў і рамесьнікаў, якія плацяць падаходны падатак і маюць толькі аднаго рабочага, ці 2-х вучняў, альбо ня маюць ні наймовых рабочых, ні вучняў, стаўкі кватэрнае платы ўстанаўляюцца ў залежнасьці ад іх даходу; ад нармальнае кватэрнае платы паводле арт. 1-га гэтае пастановы, і да 1 р. 10 к. за 1 кв. мэтр на месяц для гарадоў Менску, Гомелю і Віцебску і да 66 к. за 1 кв. мэтр для іншых гарадоў.

15. Для саматужнікаў і рамесьнікаў, якія маюць больш як аднаго рабочага альбо больш, як 2-х вучняў, стаўкі кватэрнае платы ўстанаўляюцца ў залежнасьці ад іх даходу, але ня менш 88 кап. і ня больш 1 р. 98 к. за 1 кв. мэтр у гарадох Менску, Гомелі і Віцебску і ад 88 к. да 1 р. 32 к. за 1 кв. мэтр для іншых гарадоў.

16. Майстэрні саматужнікаў, калі яны знаходзяцца ў жылых памяшканьнях, якія займаюцца саматужнікамі, аплачваюцца па стаўках, вызначаных паводле арт. арт. 13, 14 і 15 гэтае пастановы.

17. Кватэрная плата для гандляроў і іншых асоб непрадуўных катэгорый устанаўляецца ў залежнасьці ад даходу наймальнікаў кватэр у разьмеры ад 1 р. 98 к. да 3 р. 35 к. за 1 кв. мэтр жылой плошчы ў гарадох Менску, Віцебску і Гомелі і ад 1 р. 32 к. да 2 р. 20 к. за 1 кв. мэтр жылое плошчы ў астатніх гарадох.

Асобы, якія плацяць прамысловы падатак паводле сталых ставак, прыраўніваюцца да саматужнікаў і рамесьнікаў, паказаных у арт. 13-гэтае пастановы.

18. З звычайнае кватэрнае платы (арт. 2—17) робіцца скідка ў залежнасьці ад выгаднасьці кватэры:

а) для кватэр, якія знаходзяцца далёка ад цэнтру гораду—10 проц.;

б) для кватэр, у якіх няма ваданраводу альбо вадаадводу ў гарадох, дзе ёсьць ваданраводная сетка—10 проц.;

в) для кватэр, у якіх няма ваданраводу і вадаадводу ў гарадох, дзе ёсьць ваданраводная сетка—20 проц.;

г) за пакоі, якія ня маюць знадворнага асьвятленьня—50 проц.;

д) за прахадныя пакоі, калі праз іх праходзяць некалькі жыльцоў кватэры—33 пр.;

е) для кватэр, у якіх падлога ніжэй узроўню зямлі ня менш, як на 0,25 мэтра—50 проц.;

ж) за мансардныя кватэры—50 проц.

Перш за ўсё аллічваюцца процанты скідкі, паказаныя ў п. п. «а», «б» і «в» гэтага артыкулу, прычым, калі ёсьць адна з паказаных у п. «а», «б» альбо «в» выгод, то гэтая скідка адлічваецца з асноўнае кватэрнае платы данага платніка, а калі ёсьць дзве выгоды—далёкая адлегласьць ад цэнтру гораду і адсутнасьць ваданраводу альбо вадаадводу ці ваданраводу і вадаадводу, то з асноўнае кватэрнае платы адлічваецца сума гэтых скідак. Пасьля гэтага скідкі адлічаюцца ад сумы, якая застаецца пасьля адлічэньня процантаў паводле п. п. «а», „б" і «в» у парадку паступовасьці пунктаў „г", „д", „е", „ж" гэтага артыкулу,

19. Наймальнікі аплачваюць паводле паказаных вышэй нормы жылую плошчу, якую займаюць яны і іх утрыманцы—члены сям'і, а таксама іх хатнія работніцы, лічачы 9,1 кв. мэтра на чалавека. Лішкі больш за 9,1 кв. мэтр на чалавека аплачваюцца ў падвойным разьмеры. У параўнаньні з кватэрнаю стаўкаю, устаноўленаю для данае катэгорыі платнікаў. Наймальнікі—рабочыя і служачыя, альбо прыраўненыя да іх асобы аплачваюць лішкі жылое плошчы ня больш за 9,1 кв. мэтр на наймальніка ў звычайным разьмеры.

Дадатковы пакой і дадатковая плошча, што займаецца асобамі, якія маюць гэтае права паводле асобнага закону, аплачваюцца ў звычайным разьмеры.

20. Кватэрная плата ўносіцца рабочымі і служачымі, а таксама прыраўненымі паводле гэтага закону да іх асобамі не пазьней 10 дня наступнага месяца, а іншыя катэгорыі платнікаў—не пазьней 10 дня таго месяца, за які гэтая плата належыць.

21. Гэтая пастанова пашыраецца на ўсе дзяржаўныя (нацыяналізаваныя і муніцыпалізаваныя), грамадзкія, кааператыўныя і прыватныя домаўладаньні ў гарадох, апроч гасьцініц, а таксама домаўладаньняў, пабудаваных на праве забудоўкі, паводле арт. арт. 71-86-б Грамадзянскага Кодэксу (З. З. БССР 1928 г., № 16, арт. 137) альбо паводле пастановы ЦВК і СНК БССР за 26 красавіка 1928 г. „Пра заахвочваньне да жыллёвага будаўніцтва" (З. З. БССР 1928 г. № 16 арт. 139). У домаўладаньнях дзьвох апошніх катэгорый кватэрная плата ўстанаўляецца па дагаворах, а ў гасьцініцах— паводле асобных правіл і тарыфаў.

22. Кватэрная плата для рабочых і служачых і прыраўненых да іх асоб у домах, пабудаваных з 1924 г. мясцовымі саветамі і прадпрыёмствамі прамысловасьці і транспарту ўстанаўляецца паводле гэтай пастановы, прычым дазваляецца да кватэрнае платы набаўка для выплаты пазычкі і аплаты процантаў па пазычцы ня больш, як 25 проц.

23. Забараняецца браць кватэрную плату вышэй ставак, вызначаных гарадзкімі саветамі на падставе гэтае пастановы.

Асобы, якія бяруць павялічаную супроць ставак кватэрную плату з рабочых і служачых і прыраўненых да іх асоб, адказваюць паводле арт. 142 Крымінальнага Кодэксу, а за браньне павялічанай кватэрнай платы з іншых груп насельніцтва вінаватыя адказваюць паводле арт, 131 Крымінальнага Кодэксу.

24. Стаўкі кватэрнай платы, якія ўстанаўляюць гарадзкія саветы паводле гэтае пастановы, праводзяцца ў жыцьцё з 1-га красавіка 1929 г.

25. Акруговыя выканаўчыя камітэты могуць дапасоўна да гэтае пастановы рэгуляваць кватэрную плату і на нацыяналізаваныя і муніцыпалізаваныя будынкі, якія знаходзяцца па-за межамі гарадоў, выходзячы з асноўнае кватэрнае платы, якая павінна быць ня менш як 26 кап. за 1 кв. мэтр.

26. Даручаецца Народнаму Камісарыяту Унутраных Спраў пасьля ўзгадненьня з Народнымі Камісарыятамі Юстыцыі, Працы і Цэнтральным Саветам Прафэсыйных Саюзаў БССР на працягу 2-х тыдняў ад дня выданьня гэтае пастановы выдаць інструкцыю для яе ўжываньня.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
23 лютага 1929 году, г. Менск.

Пастанова калегіі НК РСІ БССР ПА „КАЛЯНДАРНАЙ СПРАВЕ" БДВ.

У № 34 нашай газэты за 13 лютага г. г. у артыкуле—„Ці ня час пачысьціць царкоўнікаў з БДВ"—мы пісалі аб буйных недарэчасьцях у настольным календары на 1929 г. выданьня Белдзяржвыдавецтва.

Як і належала чакаць, Белдзяржвыдавецтва даслала ў рэдакцыю „абвяржэньне", якое па сутнасьці выяўлялася звычайнай бюракратычнай адпіскай з замазваньнем фактаў і з лаянкай на адрасе аўтара.

Пытаньне гэта 21 лютага было абгаворана на пасяджэньні калегіі НК РСІ БССР, прычым вынесена наступная пастанова.

1) Адзначыць, што з боку Белдзяржвыдавецтва пры выданьні настольнага календара на 1928-29 г. была дапушчана буйнейшая палітычная памылка, калі ў ім былі прапушчаны адзнакі аб рэвалюцыйных сьвятах (напрыклад, 1-е мая адзначана толькі, як «яўрэйскае сьвята—апошні дзень вялікадня» і г. д.), што выклікала зусім правільны пратэст грамадзкасьці і друку («Савецкая Беларусь» № 34, ад 13-II. «Ці ня час пачысьціць царкоўнікаў з БДВ»).

2) Прапанаваць праўленьню БДВ прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасьці асоб, якім было даручана наглядаць за выпускам календара.

Папярэдзіць праўленьне БДВ аб устанаўленьні больш суровага кантролю за выпускам сваёй прадукцыі.

3) Абвяржэньне заг. БДВ т. Шыпіла на зусім правільны артыкул у «Савецкай Беларусі» прызнаць недапушчальна бюракратычным—праяўленьне жаданьня ўвесьці ў заблуду грамадзкую думку і патэтаму, адхіляючы беспадстаўныя спасылкі БДВ на абежнік Наркампрацы і нават на «тэхнічныя прычыны» (прапушчана чырвоная фарба), НК РСІ папярэдзе т. Шыпіла аб недапушчальнасьці гэткіх бюракратычных адносін да самакрытыкі, у асаблівасьці гэткай заявы: «брудная лаянка гр. Зайцава (аўтара артыкулу) не заслугоўвае таго, каб на яе адказваць».

4) Пастанову абвясьціць у друку.

Гэтак, бюракратычныя адносіны да самакрытыкі і жаданьне «втереть очки» грамадзкасьці пакараны.

Нязгай пастанова калегіі НК РСІ паслужыць добрым прыкладам усім іншым „абвяргацелям", якія замест адказу на сутнасьці высьветленых фактаў спрабуюць апошнія замазаць і ачарніць аўтара допісу.

Бюракратызм пакараны, але ці выяўлены ўсе канкрэтныя насіцелі зла ў каляндарнай справе БДВ?

З дню пастановы калегіі НК РСІ прайшло 16 дзён, а з Белдзяржвыдавецтва мы ўсё яшчэ ня маем паведамленьня, на каго і якія меры адміністрацыйнага пакараньня накладзены.

Самаабкладаньне прынята ў суме 2.075.000 р.

Паводле вестак Наркамфіну, на 1 сакавіка па ўсёй БССР сходамі насельніцтва прынята самаабкладаньне ў суме 2.075.000 руб., што складае 18 проц у адносінах да сумы сельска-гаспадарчага падатку прымаючы пад увагу, што гранічны разьмер самаабкладаньня не павінен перавышаць 25 проц. сумы падатку, вынікі прынятага па БССР самаабкладаньня можна лічыць больш-менш здавальняючымі.

Першае месца ў галіне самаабкладаньня займае Аршанская акруга, дзе сходамі самаабкладаньне прынята ў суме 333000 руб., ці 26,4 проц, падатку; на другім месцы ідзе Віцебшчына (24,1). Кепска стаіць справа з самаабкладаньнем у Бабруйшчыне (15,4 проц.), Гомельшчыне (15,4 проц.) і асабліва слаба ў Менскай акрузе, дзе сходамі прынята толькі 14 проц. ад сумы с.-гасп. падатку.

Неабходна сказаць, што сёлета самаабкладаньне праходзіць куды лепш, чымся ў мінулым годзе,—а асабліва добра ў тых мясцовасьцях, дзе своечасова і поўнасьцю скарыстаны сумы ад леташняга самаабкладаньня.

Калі справа з прыняцьцем самаабкладаньня наогул стаіць больш-менш здавальняюча, дык куды горш са зборам прынятых сум. Тут трэба зазначыць, што шмат сельсаветаў не зрабілі яшчэ раскладак прынятых сум паміж асобнымі гаспадаркамі. Толькі адна Аршанская акруга сабрала 42,8 проц. прынятых сходамі сум, Полаччына—21,6 проц. і Віцебшчына 19,1 проц. Па іншых жа акругах процант сабраных сум хістаецца—ад 5,7 проц., у Мазыршчыне, да 1,7 проц. у Меншчыне, а Гомель нават ня ведае, колькі ў яго сабрана па акрузе.

Мясцовым працаўнікам неабходна памятаць, што да пачатку сяўбы прынятыя сумы па самаабкладаньню трэба сабраць поўнасьцю. Неабходна пасьпяшацца скончыць раскладку самаабкладаньня паміж гаспадаркамі. Тлумачыць сялянству карысьць і неабходнасьць самаабкладаньня ўжо ня прыходзіцца, бо лепшым агітатарам за апошняе выяўляюцца тыя мерапрыёмствы, якія праведзены летась за сродкі самаабкладаньня.

Да недахопаў трэба аднесьці тое, што па некаторых раёнах ня ўсе леташнія сродкі скарыстаны, а таксама слаба праходзіць падрыхтоўка да наступнага будаўнічага сэзону. Да пачатку сэзону трэба ўсе больш буйныя мерапрыёмствы забясьпечыць складзенымі каштарысамі, своечасова загатовіць будаўнічыя матар'ялы, адвесьці зямельныя вучасткі для тых ці іншых пабудоў. Ня трэба паўтарыць памылак мінулага году, калі будаўнічы сэзон мы сустрэлі непадрыхтаванымі.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Менскага гарсавету.

260.000 руб. на жыльёвае будаўніцтва.

Прэзыдыум Менскага гарсавету вызначыў 260.000 руб. доўгатэрміновага крэдыту на жыльёвае будаўніцтва жактаў.

Адначасна з гэтым прэзыдыум пастанавіў давесьці да ведама Эканомнарады аб тым, што чыгуначныя органы сэлета амаль нічога ня зьбіраюцца будаваць у Менску. Трэба, каб чыгуначныя органы таксама вызначылі пэўныя сродкі на будаўніцтва.

Дэмабілізаваныя чырвонаармейцы атрымаюць працу.

Прэзыдыум гарсавету заслухаў даклад аб стане беспрацоўя сярод дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. У лістападзе на Біржы Працы знаходзілася 300 беспрацоўных дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, на 1-га лютага засталося толькі 117.

Інспэкцыі працы запрапанавана ўжыць рашучыя захады да разьмеркаваньня на работу і рэшткі чырвонаармейцаў, а таксама ўмацаваць культурнае абслугоўваньне іх.

Да пабудовы маргарынавага заводу.

Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў Бехмясгандлю падшукаць памяшканьне для арганізацыі маргарынавага заводу. Дзеля гэтай мэты міркуецца выкарыстаць памяшканьні заводаў „Чырвоны Золак", «Вершавянка» і цукерачнай фабрыкі.

Як праходзяць перавыбары Менскага гарсавету.

Водлуг вестак менскай гарадзкой выбарчай камісіі, да 5-га сакавіка паступілі заявы ад 78 прадпрыёмстваў абходзе перавыбараў на перавыбарных сходах прысутнічала 77 проц. агульнага складу, ці 17.633 чалавек. Жанчын прысутнічала 73 проц. на гэтых сходах абрана 169 дэпутатаў і 73 кандыдаты. Жанчын абрана 37, ці 22 проц. Па партыйнаму складу дэпутаты падзяляюцца: членаў КП(б)Б—108 (61 проц.), ЛКСМБ 14 (8 проц.). Па нацыянальнасьці—90 беларусаў, 56 яўрэяў, 11 расейцаў, 6 палякаў і 5 інш.

400 сэпаратараў для БССР.

Дзяржгандаль зрабіў заказ на 400 сэпаратараў і інш. малочны інвэнтар для малочных арцеляў БССР. Малочныя прылады заказаны ў Нямеччыне і Швэцыі.

Мэблю—у вёску.

Белкаапсаюз у 3 квартале завозіць у Менск равнай мэблі на 400.000 руб., з іх на 100.000 руб. жалезных ложкаў, а на рэшту—драўнянай мэблі.

Асартымэнт мэблі падбіраецца з разрахункам прасунуць яе ў вёску праз высковую спажывецкую кааперацыю. Для ўтаненьня мэблі частка яе будзе непасрэдна з вытворчасьці накіравана ў больш буйныя спажывецкія таварыствы.

СУД.

ЗА ХУЛІГАНСТВА.

7 лістапада 1928 году ў клюбе Бродаўскага сельсавету, Барысаўскага раёну, ўвечары сабралася шмат сялян, сялянак і мясцовай моладзі. Да адчыненьня спэктаклю, прысьвечанага сьвяткаваньню Кастрычнікавае рэвалюцыі, адбыўся даклад аб значэньні сьвята, Пасьля дакладу, калі ў залю клюбу сталі пранускаць публіку, п'яныя мясцовыя хуліганы ўварваліся ў клюб, сталі тушыць лямпы зьбіваць публіку, відаць бутэлькамі і галёшамі. Пры гэтым хуліганы крычалі: „даёш адміністрацыю і камсамольцаў".

Публіка пачала разьбягацца з клюбу. Урэшце, калі спэктакль быў сарваны, хуліганы узброіўшыся каламі і з крыкамі—«даёш бродаўцаў» рухнулі на вуліцы, выклікаючы сялян і камсамольцаў на бойку.

Сьвята было сарвана; хуліганы зьбілі некаторых сялян, якія прымалі актыўны ўдзел у пастаноўцы спэктаклю.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў г. Барысаве, разглядзіўшы гэту справу, прытаварыла: Хведара Марова, Сымона Багдана, Рыгора Казыра, Нічыпара Казыра, Уладзіміра Карпаковіча і Кастуся Гайдаленка па тры гады зьняволеньня кожнага в суровым адмежаваньнем, але на аснове амністыі ў адпаведнасьці з 10-й гадавінай БССР, скараціла пакараньне напалову.

А. К.

Апавяшчэньні.

У нядзелю, 10 сакавіка, а 12 гадз. дня склікаецца агульны сход членаў пісьменніцкіх аб'яднаньняў і паасобных пісьменнікаў у Доме Пісьменьніка—Савецкая, 68—для абмеркаваньня некаторых арганізацыйных пытаньняў працы Дому.

КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

У аўторак, 12 сакавіка, у 11 гадз. раніцы склікаецца агульны сход навуковых працаўнікоў гор. Менску.

Парадак дня:

1. Справаздача аб 3-м Усесаюзным зьезьдзе навуковых працаўнікоў.
2. Курортнае пытаньне і інш.

Яўка членаў сэкцыі навук. працаўнікоў абавязкова.

Даводзіцца да ведама беспрацоўных выхавацельніц, што Біржай Працы у красавіку м-цы г. г. будзе праводзіцца экспортыза.

Тыя, што ня зьяўляцца на экспортызу, будуць зьняты з вучоту беспрацоўных на Біржы Працы, так і Саюзу.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Апошнім тэрмінам для запісу ў гурткі па вывучэньню беларускай мовы для беспрацоўных членаў саюзу працасьветы зьяўляецца 14 сакавіка.

Сёньня, а 1 гадз. дня—дзіцячы ранішнік, а 6 г. увеч. пасяджэньне праўленьня; у аўторак—вечар, прысьвечаны дню зьняволеньня самадзяржаўя. Білеты па МК й групкомах.

АСАЦЫЯЦЫЯ НАП.

У панядзелак, 11 сакавіка, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні НК РСІ (Савецкая, 55), адбудзецца сход Асацыяцыі НАП, на якім будзе заслухан даклад члена праўленьня Аргбуда (Масква) т. Меймана на тэму: «Мэтодыка рацыяналізацыі ўстаноў».

Уваход вольны.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

НЯДЗЕЛЯ, 10-га САКАВІКА

Адкрыты спэктакль

„Мешчанін дваранінам".

Білеты ў касе тэатру. Рабочая паласа ў рабочай касе.

Пачатак а 8 гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 5 сакавіка. МАСТАЦКІ БАЯВІК „МЕЖРАБПОМ-ФІЛЬМ" „У ГОРАД УВАХОДЗІЦЬ ЯЯ МОЖНА". Пачатак сэансаў 1-га—7, 2-га—9-45, 3-га—10-30. Зьвыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 5.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка 5 сакавіка „6 ДЗЯЎЧАТ ШУКАЮЦЬ ПРЫТУЛКУ" У 7 ЧАСТКАХ. ПАЧАТАК У 7 ГАДЗІН.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. 2-ГІ ТЫДЗЕНЬ „ПАТ АРЫСТАКРАТ".

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА МЕНСКАЙ АКРУГІ

АКТЫЎ — *на 1-ае кастрычніка 1927 году.* — *ПАСЫЎ*

	Прыватная сума	Агульная сума
1. СРОДКІ Ў МАЁМАСЬЦІ.		
ІНВЭНТАР	67619—74	67619—74
2. СРОДКІ У ГАНДЛІ:		
ДЭБІТОРЫ:		
1. Прадаўцы	4067—13	
2. Пакупнікі	10779—83	
3. Крэдытаваньне рабочых і служачых	3169—92	
4. Авансы рабочым і служачым	293—82	
5. Падсправаздачныя сумы	3196—73	
6. Розныя асобы і ўстановы	3857—97	25365—40
ТАВАРЫ:		
1. На складзе	106719—68	
2. У лябараторыі	7826—49	
3. У прадпрыёмствах па сабекошту	112865—99	
4. У магазыне № 1 Барысаў (напрад. цане)	27314—13	
5. « » № 2 Н-Бар.	10433—65	265159—94
ВЭКСАЛІ ДА АТРЫМАНЬНЯ:		
1. У партфелі	1047—15	
2. На Такасо	205—75	1252—90
ВЫДАТКІ БУДУЧЫХ ГАДОЎ: (ПА ГАНДЛ. АПЭРАЦ.)		
1. Патэнты	968—82	
2. Страхаваньне маёмасьці	190—66	
3. % % на выдадз. вэкс. тэрм, пасьля 1-X	1229—38	2388—86
НАЛОЖАНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ		3 —
3. ГРАШОВЫ КАПІТАЛ:		
1. Каса	630—64	
2. Бягучыя рахункі	4150—05	
3. Каштоўныя паперы (абл. і пазыкі 22 г.)	2247—16	7027—85
4. НЕМАБІЛЬНЫЯ СРОДКІ:		
ВЫДАТКІ БУДУЧЫХ ГАДОЎ:		
1. Капітальны рамонт 1927-28 г.	6247—90	
2. « « 1928-29 г.	6247—91	12495—81
5. ВЭКСАЛІ Ў ВУЧОЦЕ.		
1. Па вучцёных вэксалёх	3883—49	3883—49
		385201—99

	Прыватная сума	Агульная сума
1. ЗАЁМНЫЯ СРОДКІ, ПРЫЦЯГНУТЫЯ Ў ГАНДАЛЬ		
1. Падсправаздачныя сумы	35—70	
2. Пераходныя сумы	738—89	
3. Рабочыя і служачыя	5232—94	
4. Акрфа ў рах. прыбыткаў 1925-26 г.	25393—96	
5. „ па Барыс. баляксу „	9608—41	
6. „ астача не разьмерк. па раёнах	2274 —	
7. Розныя асобы і ўстановы	6084—05	
8. Прадаўцы	12176—28	
9. Авансы пакупнікам	1872—56	
10. Банкі па вучоту	3883—49	
11. Акрфа па акцызу	6508—88	74349—15
2. ВЭКСАЛІ ВЫДАДЗЕНЫЯ		106821—62
3. НАЛІЧЭНЬНІ НА ТАВАРЫ (па астачы на 1-X—27 г.)		
1. Магазын № 1—Барысаў	7188—64	
2. „ № 2—Нова-Барысаў	2513—77	9702—41
4. КАПІТАЛ:		
1. Асноўны	67619—74	
2. Зваротны	95948—81	
3. Фонд амортызацыйны	5235—83	
4. Фонд паляпшэньня быту рабочых і служачых	817—50	169621—88
5. РЭЗУЛЬТАТЫ:		
1. Прыбытак на 1-X—27 г.		24706—92
		385201—99

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА МЕНСКАЙ АКРУГІ на 1-X—27г.

СТРАТА

	Прыватная сума	Агульная сума
1. Рах. утрыманьня штатаў	205305—91	
2. » » памяшканьняў	31596—23	
3. » канцылярскіх выдаткаў	2394—20	
4. » разьязных выдаткаў	595—49	
5. » хаваньня тавараў	7479—42	
6. » гандлёвых праў	7471—72	
7. » гаспадарчых выдаткаў	1082—71	
8. » культ-асьвет выдаткаў	235—43	
9. » інтарэсаў	8533—28	
10. » страхаваньня маёмасьці ад агню	1392—22	
11. » паштова-тэлеграфн. выдаткаў	2091—69	
12. » рамонту капітальнага	8907—82	
13. » амортызацыі інвэнтару (7 проц.)	2827—30	
14. » розных даходаў і выдаткаў	852—26	281265—68
Прыбытак за 1926-27 бюджэтны год		24706—92
		305972—60

ПРЫБЫТАК

	Прыватная сума	Агульная сума
1. Рах. продажу тавараў	256888—69	
2. Тавараў складу	29144—76	
3. Рах. тавараў лябараторыі	19939—15	305972—60
		305972—60

Загадчык аптэкакіраўніцтва І. Х. КАЦ. Галаўбух С. Б. АРАНЗОН.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПРЫБЫТКАЎ.

Падаходны падатак	10 проц. з 24706 руб. 92 к.		2470—69
У фонд паляпш. быту	10 „ „ 22236 „ 23 „		2223—62
У зваротны капітал	25 „ „ 22236 „ — „		5559—06
У мясцовы бюджэт	65 „ „ 22236 „ — „		14453—55
			24706—92

Баляно, рахунак страт, прыбыткаў і разьмеркаваньне прыбыткаў зацьверджана сталай Камісіяй пры Менакрфа і Прэзыдыумам Менскага АВК на пасяджэньні 29 студзеня 1929 г.—Пратакол № 111 і да друку дазволен.

Інспэктар-бухгальтар Менакрфа П. Ф. ЗОЛЬСКІ.